У ПРАКУРОРЫ СА... ШКОЛЬНАЙ ЛАЎКІ

ЧЫРВОНКА

ШАНС ПАТРАПІЦЬ У ІНШУЮ ЭПОХУ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 СТУДЗЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 7 (30141)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:

«Беларусь — мірная краіна, яна нікому не пагражае, але сваю краіну мы гатовы абараніць і рэагаваць на выклікі і пагрозы, якія сыходзяць у адносінах да яе, на жаль, ад краін-суседзяў — Украіны, Польшчы, краін Балтыі. Ваенная актыўнасць, вялікая колькасць вучэнняў, павялічаная разведдзейнасць з боку сумежных дзяржаў у адносінах да нас, павелічэнне ваенных бюджэтаў — усё гэта гаворыць пра зусім не мірныя падыходы ў адносінах да нашай краіны. Таму мы вымушаны рабіць адпаведныя крокі і на планавай аснове развіваць структуры ваенных арганізацый дзяржавы, у тым ліку і органаў пагранічнай службы».

Кросны Яраслявы

Яраслава СКОБ вучыцца ў 8 класе 168-й сталічнай школы. А яшчэ дзяўчына захапляецца ткацтвам: ужо восем гадоў займаецца ў студыі народнай творчасці пры Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Прычым дзяўчына валодае не толькі практычным уменнем, але і займаецца даследчыцкай работай. Нядаўна яе праект «Мая стыхія» заняў прызавое месца на рэспубліканскім фестывалі-конкурсе даследчых праектаў навучэнцаў «Нашчадкі традыцый».

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

КАРАТКА

• Мадэрнізацыя электрасетак стане адным з галоўных прыярытэтаў для энергетыкаў у Год якасці.

• **Старшынёй Мытнага камітэта Саюзнай дзяржавы назначаны Руслан Давыдаў.**

• Мінсельгасхарч: аб'ёмы вытворчасці яек у Беларусі даюць магчымасць пастаўляць 25—30 працэнтаў на экспарт.

• **Гісторыя кахання ў бронзе: у Багушэўску адкрылі прысвечаную сямейнай вернасці скульптуру «Рэха кахання», прымеркаваўшы мерапрыемства да 200-годдзя з дня нараджэння палкоўніка Дзмітрыя Багушэўскага.**

ISSN 1990 — 763X

Духоўны свет

«ХАЧУ БЫЦЬ КАРЫСНЫМ...»

Невідушчы клірык магілёўскага храма пра сябе, моц веры і сэнс Святых вечароў

Цяжка паверыць у тое, што Павел ад нараджэння нічога не бачыць. Ён добра арыентуецца ў прасторы, шмат чытае, пастаянна вучыцца, любіць тэатр, мае стасункі з сябрамі — яго жыццё насычанае падзеямі. Яму пашчасціла займацца справай, якая найбольш блізкая яго сэрцу. Павел ПАЎЛАЎ — царкоўнаслужачы, чытае святыя тэксты падчас набажэнстваў у магілёўскім храме ў гонар святых праведных Іаакіма і Ганны. Адсутнасць зроку для яго не прысуд, ён глядзіць на свет духоўнымі вачыма. Прычым вельмі аптымістычна. І з радасцю дзеліцца з чытачамі «Звязды» сваімі думкамі.

СТАР. 5

Спажывец

СКЛАДНІКІ СВЯТА

Гандаль падводзіць папярэднія вынікі работы ў навагодні і калядны перыяд

Завяршыўся адзін з самых важных і адказных для ўсіх аб'ектаў гандлю час — час навагодніх і калядных пакупак. Штогод стартуе ён у пачатку снежня і доўжыцца практычна да сярэдзіны студзеня. Канчатковыя вынікі падводзіць пакуль рана — статыстычныя даныя яшчэ фарміруюцца. Але ўжо сёння спецыялісты расказалі, на што, перад зімовымі святамі выдаткоўвалі грошы мінчане і госці сталіцы.

Фота Паўветы ГОЛАД.

Быць стрыманым і эканомным у зімовыя святы — не ў нашай традыцыі: менавіта ў гэтыя дні людзі гатовыя выдаткаваць асабістыя фінансы на падарункі і «атрыбуты свята», святочныя мерапрыемствы, накрыць годны стол. Нават калі фінансаў гэтых аб'ектыўна няшмат, пакупнік хоча даставіць радасць сабе і сваім блізкім. І важна, каб такую магчымасць яму своечасова далі і аб'екты гандлю, і ўстановы грамадскага харчавання.

СТАР. 4

Клопат

«ГЭТА ВЫДАТНЫЯ ЛЮДЗІ, У ЯКІХ ТРЭБА ВУЧЫЦЦА ЛЮБОВІ, АДДАНАСЦІ СВАЁЙ КРАІНЕ, СВАЙМУ НАРОДУ»

У рамках акцыі «Ад усёй душы» Наталля КАЧАНАВА наведала Гарадскі дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы «Світанак»

Фота БелТА.

У адкрыцці дзяржаўнай установы, якая знаходзіцца недалёка ад Мінска, у пасёлку Траскоўшчына, у лістападзе 2010 года прымаў удзел Прэзідэнт. У сучасным корпусе, дзе на дадзены момант пражывае 64 чалавекі, створаны ўсе ўмовы для камфортнага знаходжання, аказваецца якаснае медыцынскае абслугоўванне. Для арганізацыі сацыяльнай рэабілітацыі ў доме-інтэрнаце функцыянуюць зала адаптыўнай фізічнай культуры, зала для гульні ў настольны тэніс і більярд, канферэнц-зала для праглядаў фільмаў і сустрэч, пакой для настольных гульняў, бібліятэка, клубы па інтарэсах, гурткі і працоўныя майстэрні. Кожны з пастаяльцаў можа знайсці сабе ў доме-інтэрнаце занятак па душы.

«Будзе гэты Прэзідэнт — будзе мір у краіне»

Сваё знаёмства з установай Старшыня Савета Рэспублікі пачала менавіта з працоўнай майстэрні. Тут жыхары інтэрната займаюцца дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам: малююць, шыюць, вяжуць, вышываюць крыжыкам і інш. Падчас творчай работы яны слухаюць радыёспектаклі, пьюць гарбату і гутараць.

Наталля Качанава пацікавілася, хто дзе ў свой час працаваў. Як высветлілася, тут і архітэктары, і ўрачы... Напрыклад, адна з жанчын у свой час удзельнічала ў праектаванні інтэр'еру Палаца Рэспублікі і станцыі метро «Інстытут культуры». Цяпер свае творчыя здольнасці яна ўвасабляе ў шыцці лялек.

«Лялькі ручной работы куды лепшыя, чым пластыкавыя, яны як жывыя — прыгажосць!» — падзялілася ўражаннямі спікер верхняй палаты парламента.

Па яе словах, падапечныя дома-інтэрната ствараюць цудоўныя работы, якія трэба паказваць людзям. Наталля Качанава расказала, што ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» Беларускім саюзам жанчын была арганізавана выстаўка «Яе рук справа», дзе звычайныя жанчыны з розных рэгіёнаў Беларусі прадстаўлялі свае творчыя работы. «Цяпер там праходзіць выстаўка работ дзяцей з асаблівасцямі развіцця, — паведаміла яна. — Думаю, што наступны раз там трэба зрабіць вашу выстаўку, каб людзі ўбачылі».

Акрамя таго, Наталля Качанава азнаёміліся з умовамі, у якіх жывуць людзі старэйшага пакалення. У кожнага з іх — свой пакой. Многія забралі сюды свае мэблю, посуд, прадметы інтэр'еру — адным словам, утульна, як дома.

Зайшоўшы ў пакой да Алены Аўрамаўны, Старшыня Савета Рэспублікі пацікавілася здароўем жанчыны. «Здароўе падводзіць, а так усё нармальна, — сказала яна. — Умовы добрыя, дамашнія, персанал клапатлівы».

«Вельмі важна, што тут вы пад наглядам», — заўважыла Наталля Іванаўна.

«Вялікі дзякуй Прэзідэнту за гэтую акцыю («Ад усёй душы». — **«Зв.»**), што нас не забывае, за ўсё, што ён робіць для старых і малых, — дадала Алена Аўрамаўна. — У нас ёсць усё, што нам трэба. Ад усёй душы перадайце яму вялікі дзякуй за клопат. Дай Бог яму здароўя, сіл, цярпення. Людзі павінны бачыць, хто ёсць хто. Нават пры найлепшым раскладзе такога Прэзідэнта больш не будзе. Гэта даецца Богам адзін раз у жыцці».

«Былі б усе такія мудрыя, як вы, — адзначыла спікер. — Мы ўсе разумеем: будзе гэты Прэзідэнт — будзе мір у краіне».

У размове з Антанінай Іосіфаўнай, у пакоі якой таксама пабывала спікер, Наталля Качанава пацікавілася, ці задаволена жанчына ўмовамі пражывання ў інтэрнаце.

«Мне тут вельмі камфортна, — сказала пастаяльніца. — Я тут спакойная: у любы момант можна звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Умовы вельмі добрыя. Знайшла сябровак».

«Самае галоўнае для нашай краіны — гэта людзі»

Наталля Качанава наведала і святочны канцэрт, арганізаваны для пажылых людзей, якія пражываюць у доме-інтэрнаце. Найперш спікер павіншавала ўсіх з Новым годам і Раством Хрыстовым.

«Нізкі паклон вам за ўсё тое, што вы зрабілі для нашай краіны, — звярнулася да пастаяльцаў Старшыня Савета Рэспублікі. — Старэйшае пакаленне перажыло такія пазбаўленні і нягоды, якія нават цяжка сабе ўявіць. Мы шануем усё, што было створана вашай працай, вашым розумам, вашымі залатымі рукамі. Я заўсёды з гонарам кажу пра прадстаўнікоў старэйшага пакалення, якое з'яўляецца прыкладам устойлівасці, мужнасці і адданасці сваёй краіне».

Асобныя словы падзякі Наталля Качанава адрасавала людзям, якія працуюць у доме-інтэрнаце. «Сёння я пачула пра вас толькі добрыя словы, падзяку за ваша чулае стаўленне, за ваша добрае сэрца, за тое, што вы робіце для людзей, якія знаходзяцца тут, — адзначыла яна. — Вядома, гэта праца няпростая. Рабіце ўсё, каб гэтыя людзі адчувалі сябе як дома, адчувалі цеплыню і дабрыню вашых сэрцаў».

Спікер падкрэсліла, што самае галоўнае для нашай краіны — гэта людзі і клопат пра іх. «Усе прынятыя рашэнні павінны быць на карысць нашых людзей і нашай дзяржавы, — падкрэсліла яна. — Мы стараемся працаваць так, каб нашы людзі адчувалі сябе камфортна, каб быў мір і спакой у нашай краіне».

Старшыня Савета Рэспублікі перадала дырэктару дома-інтэрната сертыфікат на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы і салодкія пачастункі. У сваю чаргу, падапечныя ўстановы ўручылі Наталлі Качанавай падарунак, зроблены сваімі рукамі. Сустрэча працягнулася размовай за гарбатай.

У гутарцы з журналістамі спікер верхняй палаты парламента выказала радасць, што людзі старэйшага пакалення могуць знаходзіцца ў такіх выдатных умовах. «Самае галоўнае — яны не адчуваюць сябе адзінокімі, гэта вельмі важна, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Цудоўна, што на працягу некалькіх гадоў праходзіць акцыя «Ад усёй душы», але людзі старэйшага пакалення ў нашай краіне заўсёды карыстаюцца пашанай і павагай. У людзей, якія знаходзяцца тут, дзяцінства было апалена вайной, яны перажылі цяжкія пасляваенныя гады, аднаўлялі краіну, падымалі яе з руін. Пасля развалу Савецкага Саюза яны стваралі сваёй працай нашу суверэнную, незалежную Беларусь. Таму нізкі паклон ім, словы ўдзячнасці і падзякі за ўсё, што яны зрабілі для нашай краіны».

Па словах спікера, жыццё многіх людзей старэйшага пакалення можа паслужыць прыкладам для сучаснай моладзі. Наталля Качанава папрасіла іх часцей сустракацца і гутарыць з малады-мі людзьмі. «Гэта выдатныя людзі, у якіх трэба вучыцца любові, адданасці сваёй краіне, свайму народу, — рэзюмавала Наталля Качанава. — Нягледзячы на цяжкія ўмовы, якія перажылі гэтыя людзі, яны заўсёды былі адданыя сваёй Радзіме. Гэта вельмі важна».

Вераніка КАНЮТА.

«Трэба ўважліва ставіцца да праблемных пытанняў, якія ставіць насельніцтва...»

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА прыняў удзел у сустрэчы з актывам Магілёўскай вобласці

Фота БелТА.

Асаблівая ўвага — сельскім раёнам, выкананне даручэння Прэзідэнта «Адзін раён — адзін праект». **Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** звярнуў увагу на рэалізацыю маштабных праектаў. Такіх, як будаўніцтва ўнутрыкальцавой дарогі ў Магілёве, капітальнага рамонту бабруйскай гарадской бальніцы імя Марзона і іншыя. Значныя сродкі выдзяляюцца на паляпшэнне дарожнай інфраструктуры. Летась на гэтыя мэты было накіравана болей за 52 мільёны рублёў. Сёлета фінансаванне павялічыцца да 71 мільёна рублёў. Старшыня аблвыканкама таксама спыніўся на фактах, якіх не павінна быць у рабоце, бо яны падрываюць аўтарытэт улады.

— Асноўны кірунак развіцця Магілёўскай вобласці — паляпшэнне якасці жыцця людзей, а ўсё астатняе — складнікі: дарогі, добраўпарадкаванне, работа эканомікі, адукацыя, ахова здароўя, культура. І мы будзем працаваць па кожным кірунку, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка. — Мы, як прадстаўнікі ўлады, павінны служыць народу і рабіць усё, каб яму было камфортна. Самае галоўнае, што мы бачым праблемы і ведаем, як іх вырашаць. Дзякуй дзяржаве, Прэзідэнту, ураду — па многіх кірунках былі выдзелены рэсурсы, мы іх засвоілі і тое, што паабяцалі людзям, зрабілі. Гэта галоўны вынік. Напярэдадні перадвыбарнай кампаніі сустрэліся і прагаварылі пытанні, якія нас хвалююць. Данеслі да людзей, каб яны ведалі, што мы ў курсе праблематыкі і працуем над гэтым.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка адзначыў, што лічыць справядлівымі папрокі ў адрас тых раёнаў, якія не паспелі засвоіць грашовыя сродкі, што выдзяляліся. Гэтыя раёны павінны арганізавацца, бо ад гэтага залежыць стварэнне камфортных умоў для грамадзян.

— На сустрэчы з актывам вобласці прагучала справаздача аб рабоце рэгіёна за мінулы год. Гэта справаздача не толькі перад актывам, але і перад насельніцтвам Магілёўскай вобласці пра тое, што зроблена, — акцэнтаваў ён. — У даступнай форме было расказана і ветэранам дзяржаўнага будаўніцтва, і дэпутатам, і кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый, грамадскіх структур, як працавала вобласць летась, каб павысіць камфортнасць жыцця насельніцтва, развіваць сацыяльную сферу, што было дасягнута і якія задачы стаяць у 2024 годзе. З аналізу той інфармацыі відаць, што вобласць робіць сур'ёзныя крокі і ў плане развіцця сацыяльнай сферы, аховы здароўя, адукацыі, а таксама дарожнага будаўніцтва, рамонту двароў, дарог, населеных пунктаў. Па некаторых кірунках фінансаванне было павялічана ў разы. І такая ж накіраванасць захаваецца ў 2024 годзе. Тое, пра што гаварылася на сустрэчы, трэба на канкрэтных прыкладах паказваць і расказваць насельніцтву. І ўважліва ставіцца да праблемных пытанняў, якія ставіць насельніцтва. Асабліва ў сельскай мясцовасці. Нават калі ўсе мерапрыемствы, якія мы праводзім, здавалася б, якасныя, ураженні ад іх можа разбурыць адна нявырашаная праблема. Гэты год асаблівы. Па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы ён аб'яўлены Годам якасці, у шырокім сэнсе слова — якасці нашага жыцця, вытворчасці, мерапрыемстваў, якія мы праводзім. У тым ліку і грамадска-палітычных, каб яны былі цікавыя і актуальныя, мелі канкрэтную накіраванасць і вынік.

Ігар Сергеенка таксама адзначыў, што падрыхтоўка да выбараў у краіне ідзе сваім ходам. Абстаноўка стабільная, пад кантролем. У краіне арганізаваны ўвесь комплекс дзеянняў для забеспячэння спакойнай абстаноўкі на месцах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

«У Беларусі праяўляецца самы вялікі клопат аб старэйшым пакаленні»

У рамках акцыі «Ад усёй душы» Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА пабываў у Глыбоцкім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што рэспубліканская дабрачынная акцыя праводзіцца па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы. Яе мэта — удзяліць больш увагі пажылым людзям.

«Безумоўна, для нас, заканадаўцаў, важна паглядзець, што трэба яшчэ зрабіць у плане ўдасканалення заканадаўства (хоць на гэты конт ужо шмат зроблена, і сёння беларускае заканадаўства, бадай, найлепшае сярод СНД), — удакладніў Уладзімір Андрэйчанка. — З іншага боку, гэта магчымасць выказаць словы падзякі, удзячнасці нашаму старэйшаму пакаленню за той вялізны ўклад, які яны ўнеслі ў будаўніцтва моцнага фундамента беларускай дзяржаўнасці».

Спікер ніжняй палаты парламента звярнуў увагу на тое, што старэйшае пакаленне — асабліве. «Так атрымалася ў гісторыі, што яно стварала такую ўнікальную дзяржаву, як Савецкі Саюз, — канкрэтызаваў ён. — На шчасце, яшчэ жывыя асобныя ветэраны. Гэта пакаленне змагалася з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны і перамагло, адбудавала і аднавіла Беларусь і сёння працуе на ўмацаванне краіны. У Беларусі праяўляецца, я лічу, самы вялікі клопат аб старэйшым пакаленні. Гэта ўзведзена ў ранг дзяржаўнай палітыкі, што сведчыць аб сталасці нашага грамадства».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў павіншаваў калектыў дома-інтэрната і людзей, якія пражываюць у ім, з калядными і навагоднімі святамі, пацікавіўся, што іх клапоціць. Ён таксама азнаёміўся са створанымі ва ўстанове ўмовамі, выставай вырабаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца тыя, хто пражывае ў доме-інтэрнаце, і наведвальнікі раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва. Пытанні, якія хвалююць людзей сярэбранага ўзросту, удзельнікі сустрэчы абмеркавалі за круглым сталом «Падзяліся цяплом сваёй душы».

Паводле БелТА.

Прыёмная кампанія — 2024

Што зменіцца для абітурыентаў у бягучым годзе?

Кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ, які карэкціруе Правілы прыёму асоб для атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Разбіраемся, што ж змянілася ў парадку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

Па-першае, указ прадугледжвае змяненне тэрмінаў рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне **(упершыню рэгістрацыя пройдзе з 9 да 22 красавіка),** а таксама правядзенне ЦЭ і ЦТ у адзіныя тэрміны для ўсіх выпускнікоў бягучага і мінулых гадоў. 27 мая пройдзе ЦЭ і ЦТ па прадмеце на выбар, 30 мая — ЦЭ і ЦТ па беларускай ці рускай мове і 3 чэрвеня — ЦТ па прадмеце на выбар для тых, хто плануе паступаць у ВНУ. Гэта важны пункт, таму што шмат гадоў рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне праходзіла ў маі. А цэнтралізаваны экзамен і цэнтралізаванае тэсціраванне праводзіліся летась у розныя тэрміны.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

У абноўленых правілах забяспечваецца таксама магчымасць паступлення без уступных іспытаў асоб, якія маюць залаты (сярэбраны) медаль або дыплом аб сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі з адзнакай у рэгіянальныя ўстановы вышэйшай адукацыі (за выключэннем спецыяльнасцей профілю адукацыі «ахова здароўя», спецыяльнасцей «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Усходазнаўства», а таксама спецыяльнасцяў, дысцыплінамі профільных выпрабаванняў якіх з'яўляюцца «Творчасць» і «Фізічная культура і спорт»).

У сталічныя ВНУ ўладальнікі школьных медалёў і дыпломаў з адзнакай змогуць паступаць без іспытаў толькі на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці.

Акрамя таго, павышаецца статус абітурыентаў — выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка і пашыраецца пералік спецыяльнасцяў, куды тыя змогуць паступаць без уступных іспытаў.

Пашыраюцца таксама магчымасці для паступлення ў спецыялізаваныя ўстановы вышэйшай адукацыі выпускнікоў профільных класаў ваенна-патрыятычнай накіраванасці і ваенна-патрыятычных клубаў.

Для абітурыентаў-мэтавікоў уводзіцца ніжні парог сярэдняга бала атэстата — ён павінен быць не ніжэйшы за 7 (за выключэннем найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў).

У абітурыентаў будзе магчымасць паступлення на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі па конкурсе сярод асобных арганізацый-заказчыкаў, калі конкурс па спецыяльнасці ў цэлым не адбыўся.

Для абітурыентаў, якія паступаюць на агульных падставах, устанаўліваецца квота не менш як 20 працэнтаў ад плана набору (па медыцынскіх спецыяльнасцях — не менш як 10 працэнтаў).

У Міністэрстве адукацыі падкрэсліваюць, што ў новай рэдакцыі Правілаў прыёму захавалася магчымасць паступлення без уступных іспытаў у рэгіянальныя ВНУ для пераможцаў рэгіянальных універсітэцкіх алімпіяд. Дарэчы, пералік спецыяльнасцяў, на якія яны змогуць прэтэндаваць, пашырыцца. Правядзенне ўнутраных уступных іспытаў і залічэнне ў ВНУ абітурыентаў-мэтавікоў і пераможцаў рэгіянальных універсітэцкіх алімпіяд выдзелена ў асобны этап прыёмнай кампаніі (з 27 чэрвеня да 12 ліпеня).

Пералік ліцэяў, якія дзейнічаюць у структуры ВНУ, выпускнікі якіх змогуць паступаць без экзаменаў, пашырыўся. Цяпер такая магчымасць ёсць у выпускнікоў ліцэяў БДУ, БНТУ, ВДУ, БРУ і Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яны могуць паступаць ва ўніверсітэт без уступных іспытаў пры наяўнасці адзнак не ніжэй за 9 балаў па профільных прадметах і не ніжэй за 8 балаў па ўсіх астатніх вучэбных прадметах.

— Мадэрнізацыя Правілаў прыёму асоб для атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца важным крокам у развіцці сістэмы адукацыі, — лічыць **рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Сяргей ХАРЫТОНЧЫК.** — На мой погляд, гэтыя змяненні робяць атрыманне вышэйшай адукацыі яшчэ больш прывабным, што дасць магчымасць прыцягнуць большую колькасць матываваных абітурыентаў.

Прыёмная кампанія 2023 года паказала, што правілы прыёму рэалізаваны з улікам прынцыпаў празрыстай і справядлівай ацэнкі ведаў абітурыентаў. Лічу, што правядзенне ЦЭ і ЦТ у 2024 годзе ў адзіныя тэрміны для ўсіх выпускнікоў бягучага і мінулых гадоў дасць магчымасць удасканаліць забеспячэнне роўных умоў для абітурыентаў, якія здаюць ЦЭ і ЦТ.

У Беларусі 2024 год аб'яўлены Годам якасці, што азначае павышаную ўвагу да пытанняў якасці ва ўсіх сферах жыцця, уключаючы адукацыю. Важна, каб захоўваўся баланс паміж даступнасцю і якасцю, пры гэтым усе абітурыенты мелі роўныя магчымасці для паступлення незалежна ад іх сацыяльна-эканамічнага статусу.

Сёння мы надаём вялікае значэнне мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў, актуальнай для нацыянальнай эканомікі і яе рэальнага сектара. Упэўнены, што прыём студэнтаў на навучанне па мэтавым дагаворы ва ўстановы вышэйшай адукацыі — адзін з найбольш перспектыўных і запатрабаваных спосабаў атрымання якаснай адукацыі з гарантыяй наступнага працаўладкавання. На мой погляд, вучыцца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі павінны найбольш матываваныя, здольныя і ўсебакова развітыя абітурыенты. Гэтаму будуць садзейнічаць новаўвядзенні, занатаваныя ў абноўленых Правілах.

Таксама лічу справядлівым, што з гэтага года мы атрымліваем магчымасць прымаць без уступных іспытаў выпускнікоў ліцэяў пры ВНУ. Такая сістэма прыёму забяспечыць бесперапыннасць сістэмы адукацыі «школа—універсітэт» і, вядома ж, будзе стымуляваць ліцэістаў больш актыўна вывучаць складаныя і цікавыя прадметы, каб атрымаць высокі сярэдні бал атэстата, паспяхова здаць выпускныя экзамены і быць прынятымі ў ВНУ без дадатковых выпрабаванняў. Акрамя таго, гэта дапаможа ВНУ папоўніць свае рады прафесійна-арыентаванымі студэнтамі, якія змогуць унесці значны ўклад у развіццё навукі, тэхналогій і грамадства ў цэлым.

Упэўнены, што абноўленыя правілы дазволяць будучым студэнтам больш свядома падысці да выбару спецыяльнасці і навучальнай установы. Безумоўна, такія новаўвядзенні будуць садзейнічаць павышэнню якасці адукацыі і стварэнню ўмоў для рэалізацыі патэнцыялу маладых людзей, якія імкнуцца да атрымання вышэйшай адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Па сутнасці

ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ ЯКАСЦІ

Кажуць, што калі хочаш змяніць свет, то пачні з сябе. Беларусы не імкнуцца мяняць цэлы свет, хоць лідар другой эканомікі свету напрыканцы мінулага года выказаўся на гэты конт дакладна — маўляў, Кітай і Беларусь адказныя за новае ўладкаванне свету. Але ж мы пачнём з сябе. З якаснага абнаўлення. У Беларусі ёсць свая палітычная культура. Свае традыцыі. Адна з іх — вызначаць назву (а адсюль і сэнс) кожнага года. Сёння мы жывём у Год якасці. Амаль трэць месяца. Але ці адчулі мы гэта? Вось у тым і справа: не адчуваць трэба, а пачынаць з сябе.

Нездарма ж Першы растлумачыў, які сэнс у Года якасці. Растлумачыў вельмі дакладна, засталося гэтак жа якасна выканаць даручэнні кіраўніка краіны. Гэта даручэнні для нашай краіны, нібыта заклік з будучыні. Інакш застанёмся на сваім месцы. Месцы неблагім, але ж варта наперад, уверх. Па-беларуску — значыць, якасна. Такі міжнародны мэйнстрым у нашай краіны. Яшчэ на світанку незалежнасці кіраўнік дзяржавы разам са зберажэннем дзяржаўнай уласнасці настаяў і на захаванні стандартаў — залатой спадчыны савецкага мінулага. Ужо тым самым Першы задаў тон развіццю якаснай краіны. Асабліва гэта важна цяпер, у эпоху сусветнага культу спажывання. Любы спажывец беларускай прадукцыі — няважна, тут або за межамі нашай краіны — ведае, што каўбаса з Барысава альбо сыры з Брэста смачныя і бяспечныя.

Так, любы матэрыял пра беларускія тавары суправаджаецца каментарыямі і лайкамі. Так, самая звычайная шыльда «Тавары з Беларусі» — найлепшая стратэгія продажаў. За беларускае спрабуюць выдаваць сурагат і нядобрасумленныя канкурэнты, і фірмы-аднадзёнкі. Капіруюць — значыць, карыстаецца попытам. Але якасць гэту трэба захаваць і прымножыць. Бо нават на рынках суседняй Расіі не так ужо раздольна, там таксама ўзяліся за развіццё аграрнай прамысловасці. Адным словам, калі едзем у Тулу са сваім самаварам, дык ён павінен быць лепшы, чым мясцовы. Вось які час надышоў. І гэта датычыцца не толькі нашых легендарных харчовых брэндаў, але і ўсёй прадукцыі: ад гродзенскіх шкарпэтак да жодзінскіх БЕЛАЗаў.

Нездарма ж лідар краіны адразу адзначыў, што Год якасці датычыцца не толькі прамыслоўцаў. «Зроблена ў Беларусі» павінна гучаць нават зычней, чым «Made in USSR». Смелая і дасягальная вяршыня. Шмат, што здавалася неверагодным, цяпер дзейнаснае. Мы ж беларусы. Кажам пра беларускую якасць — маем на ўвазе нашы смятану, сыры, каўбасы і цукеркі. Але такім жа «смачным» павінна стаць яшчэ многае. Ад мікрачыпаў да паслуг у авіяцыі, напрыклад. Каб выруліць у гэтай геапалітычнай турбулентнасці, бітве санкцый і за рынкі збыту, патрэбен найвышэйшы пілатаж. Нездарма Першы адзначыў, што эканоміка Беларусі нагадвае нямецкую. Таксама экспартаарыентаваная. Але ці мы працуем гэтак жа сумленна, як немцы? Дык усё ў нашых руках. Прычым літаральна. Каб не з зайздрасцю казалі: вось, маўляў, «нямецкая якасць», а з гонарам — «гэта беларускае»!

Сутнасць якасці — стабільнасць. І справядлівасць, каб вытворца не гуляў з пакупніком у несумленныя гульні. Выгадней, вядома, нашпігаваць прадукцыю таннай хіміяй, але дырэктарат і тэхнолагі беларускіх прадпрыемстваў паважаюць спажыўцоў. Сумленнасць больш выгадная за нажыву. Дарога да пакупніка нялёгкая, а расчараваць можна за адзін раз. Так, усё пад пільным наглядам Дзяржстандарта. У нас больш за трыццаць тысяч стандартаў, амаль сем дзясяткаў эталонаў. Але не толькі пра гэта размова.

У грамадстве ёсць запыт на якасць. У нас у краіне вялікая ўвага ўдзяляецца яе кантролю. Гэта шануюць спажыўцы, і гэта неабходна захаваць. З такой прапановай да Прэзідэнта звярнуліся ў час візіту Першага на гомельскае прадпрыемства «Крышталь». Беларускі тавар, як і вырабы з каштоўных матэрыялаў, павінен быць адзначаны Знакам якасці.

Нельга больш жыць напалову, давайце дыхаць на поўныя грудзі. Калі ідзём далей сваім шляхам, значыць, хопіць таптацца на месцы. Свету насаджаюць спажывецкі канвеер. Адны вечна спажываюць, іншыя за гэты кошт узбагачаюцца. Апетыт прыходзіць падчас ежы. І чым хутчэй круціцца гэты канвеер, тым горшымі становяцца прадукты. Руліць цывілізацыя пластыку і хіміі. Але Беларусь — гэта іншае. Мы ствараем сваю цывілізацыю якасці, і гэта абавязкова ацэняць.

Яўген ПУСТАВОЙ.

❍ У тэму

СТАЎКА — НА МАТЫВАВАНУЮ МОЛАДЗЬ

Новая рэдакцыя Правілаў прыёму ў ВНУ дазволіць прыцягнуць у педагагічную прафесію матываваных абітурыентаў. У гэтым упэўнены рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК.

«Усе адлюстраваныя ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь змяненні і дапаўненні накіраваны на забеспячэнне аб'ектыўнасці пры ацэньванні ведаў абітурыентаў і справядлівы конкурсны адбор пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі, — падкрэслівае Аляксандр Жук. — Мяне як рэктара вядучага педагагічнага ўніверсітэта краіны натхняе і тое, што новая рэдакцыя Правілаў прыёму дазволіць прыцягнуць у педагагічную прафесію матываваных і здольных абітурыентаў — пераможцаў алімпіяд, уладальнікаў атэстатаў і дыпломаў з адзнакай, выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці. Пройдзе ўсяго чатыры-пяць гадоў, і цяперашнія абітурыенты — ужо дыпламаваныя спецыялісты — вернуцца ў школы з важнай місіяй: навучаць і выхоўваць падрастаючыя пакаленні беларусаў.

Важным лічу і прыцягненне на педагагічныя спецыяльнасці найбольш падрыхтаваных выпускнікоў, якія паступаюць на ўмовах мэтавага набору. Гэтаму будзе садзейнічаць замацаванне парога сярэдняга бала атэстата не ніжэй за 7 балаў».

Як заўважыў рэктар БДПУ, уступная кампанія мінулага года ў рамках мэтавага набору выявіла наступную праблему — недастаткова моцны канкурэнтны складнік. Новая рэдакцыя Правілаў прыёму прадугледжвае правядзенне конкурсу сярод асобных арганізацый-заказчыкаў. «Гэта, на наш погляд, будзе садзейнічаць актывізацыі прафарыентацыйнай работы з боку заказчыкаў кадраў і дазволіць ім гарантавана атрымаць патрабаванага спецыяліста, — патлумачыў ён. — Важным новаўвядзеннем прыёмнай кампаніі з'яўляецца таксама ўвядзенне квот для залічэння катэгорый абітурыентаў, якія паступаюць на агульных падставах на шэраг папулярных педагагічных спецыяльнасцяў («Філалагічная адукацыя», «Прыродазнаўчая адукацыя», «Гістарычная адукацыя», «Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя» і іншыя), якія раней запаўняліся пераважна льготнікамі, — не менш за 20 працэнтаў ад плана набору».

Новая рэдакцыя Правілаў будзе садзейнічаць удасканаленню нацыянальнай сістэмы адбору і падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй. Упэўнены, што дзякуючы гэтаму ў педагагічную прафесію прыйдзе больш падрыхтаваная і матываваная моладзь».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Валянціне Аляксееўне НАЗАРАНКА, намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.

СКЛАДНІКІ СВЯТА

Фота Пазаветы ГОПАД.

НАВАГОДНІ НАСТРОЙ — РУХАВІК ПРОДАЖАЎ

— Штогод напярэдадні святкавання Новага года і Раства Хрыстова сталічны гандаль ажыццяўляе падрыхтоўку па забеспячэнні павышанага пакупніцкага попыту па ўсіх групах харчовых і нехарчовых тавараў, а таксама па аказанні паслуг грамадскага харчавання, — адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ірына МАСЛАКОВА.** — Суб'ектамі гандлю праведзены падрыхтоўчыя мерапрыемствы, актывізавана работа з прадпрыемствамі-вытворцамі краіны і пастаўшчыкамі па фарміраванні неабходнай колькасці таварных запасаў, шырокага асартыменту падарункаў, сувеніраў, тавараў з каляднай і навагодняй тэматыкай. Як вынік, у перадсвяточныя і святочныя дні быў арганізаваны бесперабойны гандаль усімі групамі тавараў, у тым ліку павышанага попыту. Гэта, у прыватнасці, такія прадукты, як кандытарскія вырабы, рыба, морапрадукты, шампанскае і ігрыстыя віны, каўбасныя вырабы і многае іншае. Таксама ў шырокім асартыменце былі прадстаўлены падарункавыя наборы з цукерак ад айчынных вытворцаў у розных пакаваннях (мяккія цацкі, тубы, гульнявыя наборы і г. д.).

Навагодні настрой — адзін з важных складнікаў пакупніцкай актыўнасці ў святы, і сталічны гандаль паклапаціўся пра гэта.

— Суб'ектамі гандлю і грамадскага харчавання былі рэалізаваны праекты па тэматычным афармленні гандлёвых залаў, прылеглых тэрыторый і фасадаў, — звярнула ўвагу Ірына Маслакова.

І, вядома, у буйных універмагах Мінска, іншых аб'ектаў гандлю была арганізавана работа спецыялізаваных навагодніх аддзелаў.

— У прыватнасці, пакупнікам было прапанавана больш за 2 тысячы найменняў ёлачных упрыгожванняў і сувеніраў, а таксама сфарміраваных падарункаў, — дадала прадстаўнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. Дакладныя звесткі статыстыкі — лічбы, якія характарызуюць вынікі навагодняга і каляднага гандлю, будуць сфарміраваны крыху пазней, сказала Ірына Маслакова. Але ўжо сёння можна казаць аб тым, што тавараабарот арганізацый гандлю і грамадскага харчавання ў снежні і пачатку студзеня чакана вырас, а таксама павялічыўся таварны чэк на аднаго пакупніка.

Забеспячэнне стабільнасці на спажывецкім рынку ў святочныя дні — адна з найважнейшых задач, якая стаяла перад кіраўніцтвам сферы гандлю напярэдадні Новага года і Калядаў. У снежні спецыялісты ўзмацнілі кантроль за забеспячэннем рознічнага гандлю таварамі навагодняга асартыменту, цэнамі на тавары павышанага спажывецкага попыту. Манітарынгі наяўнасці тавараў у розных арганізацыях гандлю, у тым ліку святочнага асартыменту, праводзіліся пастаянна.

— Упраўленне гандлю Мінгарвыканкама актыўна абследавала крамы з мэтай арганізацыі бесперабойнага гандлю і даступнасці тавараў для спажыўца, і падчас гэтых праверак мы бачылі, што павышаны попыт на тавары існуе, а сярэдні чэк, мяркуецца, павялічыўся, — адзначыла Ірына Маслакова.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЁЛКІ, КІРМАШЫ І КВЭСТ

Ёлачныя кірмашы — неад'емная частка зімовых свят. Іх прайшло ў сталіцы 67. Акрамя таго, навагоднія ёлкі (хвоі, піхты), штучныя і «жывыя», былі прадстаўлены на святочных кірмашах, у розных гандлёвых аб'ектах і на прылеглых да іх тэрыторыях. Цэнавы дыяпазон стартаваў ад 20 рублёў, дадала спецыяліст. У цэлым, кошт залежаў ад вышыні і пышнасці, іншых характарыстык дрэва. Дарэчы, можна адзначыць, што сёлета дастаткова вялікая колькасць нашых суграмадзян аддалі перавагу жывым ёлкам перад штучнымі, хоць усе папярэднія гады выбар спажывец рабіў адназначна на карысць «пластыку». Таксама пакупнікам у гэтым годзе актыўна прапаноўваліся ёлкі, хвоі і піхты ў кадках — самы «экалагічны» варыянт.

Навагоднія кірмашы ў сталіцы праходзілі ў кожным адміністрацыйным раёне. Яшчэ перад Новым годам спецыялісты МАРГ адзначалі: штогод плануецца адна колькасць святочных кірмашоў, але па выніках навагодняга сезона такіх мерапрыемстваў заўсёды аказваецца больш. У любым выпадку недахопу ў навагодніх кірмашах у сталіцы не адчувалася. Найбуйнейшы, па традыцыі, разгарнуўся на пляцоўцы каля Палаца спорту: у ім прынялі ўдзел звыш 50 суб'ектаў, у тым ліку рамеснікі. Кірмаш і сёння працягвае сваю работу. Ён будзе адкрыты да 14 студзеня. Заўважым, што, хоць навагодні і калядны сезон можна лічыць «закрытым», у шэрагу гандлёвых аб'ектаў усё яшчэ дзейнічаюць святочныя скідкі, так што пакупнік можа паспець «ускочыць у апошні вагон». Калі вы забыліся ці не паспелі зрабіць камусьці падарунак або парадаваць сябе і блізкіх — самы час. І яшчэ адна заўвага: эканомныя купляюць ёлачныя цацкі і гірлянды... пасля Новага года, ужо для наступнага. І гэта разумна: пакупніцкі ажыятаж сціхнуў, цэны на гэты «сезонны тавар» ужо практычна ўдвая ніжэйшыя, а час хуткаплынны. І наступнай зімой вы пахваліце сябе за прадбачлівасць.

Новаўвядзеннем гэтага навагодняга і каляднага перыяду стала прэзентацыя «тэхнаёлак», расказала прадстаўнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. Кожны дзень пачынаючы з сярэдзіны снежня на пляцоўцы каля Палаца спорту раёны сталіцы прэзентавалі сваё ўнікальнае бачанне галоўнага сімвала Новага года (фотарэпартаж з аглядам усіх ёлак-удзельніц нашы чытачы бачылі ў першым нумары гэтага года і на сайце zviazda.by).

Акрамя таго, другі год запар у сталіцы праходзіў навагодні квэст. У гэтым годзе ён называўся «Разам з Мінскам у 2024 год». Па яго умовах, трэба было наведаць мінімум 10 гарадскіх пляцовак, уключаных у інтэрактыўную карту, і атрымаць падарунак. Стартаваў квэст 23 снежня, інтэрактыўную карту яго ўдзельнікі шукалі на сайце Мінгарвыканкама, а фінальнай лакацыяй для атрымання заслужанага падарунка па выніках праходжання квэсту стаў кірмаш каля Палаца спорту.

— Падарункі ўдзельнікі змогуць атрымаць да 14 студзеня, — рэзюмавала спецыяліст.

Гэтыя і іншыя спадарожныя мерапрыемствы (канцэрты і выступленні артыстаў, вогненнае шоу і г. д.) дазволілі павялічыць прыток наведвальнікаў. У цэлым, наведванне навагодніх кірмашоў у параўнанні з папярэднімі гадамі ў сталіцы было актыўным, расказала Ірына Маслакова.

Вялікай цікавасцю ў мінчан і гасцей горада ў гэтыя святочныя дні карыстаўся навагодні кірмаш каля Вялікага тэатра (гэта відаць па сацсетках, адзначыла Ірына Маслакова). Кірмаш каля Опернага стаў навінай сёлетняга святочнага сезона. Гэтая лакацыя, дарэчы, была ўключана ў квэст.

— Арганізатарам пляцоўкі выступаў суб'ект гаспадарання самастойна. Мы адкрыты да дыялогу, і калі на будучы Новы год з'явяцца прапановы па новых цікавых пляцоўках для кірмашоў і яны не будуць стварацьнязручнасць жыхарам і рабоце камунальных службаў, мы з задавальненнем падтрымаем іх правядзенне, — адзначыла спецыяліст.

ШТО КУПЛЯЛІ?

І, зразумела, цікава, якія тавары былі найбольш запатрабаваны ў навагоднія і калядныя святы. Гэта натуральныя і штучныя ёлкі, ёлачныя цацкі і ўпрыгожанні. У пакупальніцкім прыярытэце былі таксама навагоднія сувеніры (у першую чаргу — фігуркі сімвала года).

— Што да харчовай сферы, акрамя тавараў штодзённага попыту, якія таксама былі прадстаўлены ў Новы год на святочных сталах, павышаны попыт адзначаўся адносна кандытарскіх вырабаў, — расказала спецыяліст. — І ў першую чаргу гэта цукеркі ад айчынных вытворцаў.

Кандытарскія вырабы — важная частка навагодняга настрою: у зімовыя святы прынята забываць не толькі аб эканоміі, але і аб дыеце, і гэта, мабыць, правільна, бо час ад часу нават самым сур'ёзным і адказным дарослым не перашкодзіць расслабіцца і адпачыць. Дык вось, сёлета прадпрыемствы «Белдзяржхарчпрама» выраблялі больш за 2 мільёны навагодніх падарункаў, і ўсё гэта багацце было пастаўлена ў гандлёвую сетку краіны. На паліцах гандлёвых аб'ектаў пакупнікам было прадстаўлена каля 70 найменняў салодкіх навагодніх падарункаў вагой ад 300 г да 2 кг і коштам ад 8 да 80 рублёў.

Таксама практычна ў кожным прадуктовым спісе тых, хто закупляўся да Новага года і Калядаў, былі шампанскае або ігрыстыя віны. Акрамя таго, да тавараў павышанага пакупніцкага попыту напярэдадні зімовых свят можна аднесці сёлета так званыя прэміяльныя прадукты, адзначыла прадстаўнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. Гэта сыры, каўбасныя вырабы, морапрадукты больш высокага цэнавага дыяпазону.

У цэлым прадстаўнікі гандлю з радасцю канстатуюць: на фоне чаканага павелічэння ў навагодні перыяд тавараабароту можна зрабіць выснову, што пакупнік стаў давяраць айчынным таварам: і харчовыя, і нехарчовыя былі запатрабаваныя. Як вядома, агульнапрызнанай з'яўляецца якасць беларускіх тавараў. І тое, што за іх наш спажывец «галасуе рублём», сімвалічна ў сувязі з тым, што 2024 год аб'яўлены ў нашай краіне Годам якасці.

Дастойным завяршэннем года не толькі для мінчан, але і для ўсіх беларускіх пакупнікоў і гасцей краіны стала адкрыццё ў Мінску маштабнай «вітрыны тавараў айчынных вытворцаў». Гэта «Першы нацыянальны гандлёвы дом», які прадставіў найлепшую беларускую прадукцыю з усіх рэгіёнаў нашай краіны, адзначыла спецыяліст. 133 фірменныя крамы, кафэ і рэстараны, бытавыя аб'екты размешчаны на трох паверхах па адрасе праспект Незалежнасці, 134. «Першы» адкрыўся 29 снежня, і калі вы яшчэ не паспелі там пабываць у мінулым годзе, то яго наведванне — выдатны спосаб узняць сабе настрой ужо ў годзе новым.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Польшчы ў прэзідэнцкім палацы затрымалі былога кіраўніка МУС і яго намесніка

Былы кіраўнік МУС Польшчы Марыюш Каміньскі і яго экс-намеснік Мацей Вонсік (дэпутаты ад партыі «Права і справядлівасць») былі затрыманы паліцыяй у прэзідэнцкім палацы ў Варшаве, паведаміла RMF24. «Затрыманы ў адпаведнасці з рашэннем суда. Супрацоўнікі канцылярыі прэзідэнта Польшчы не аказвалі супраціўлення», — напісаў у сацсетцы намеснік міністра ўнутраных спраў Польшчы Чэслаў Мрочак. Паведамляецца, што Каміньскі і Вонсік прыбылі ў прэзідэнцкі палац па запрашэнні кіраўніка дзяржавы Анджэя Дуды. Аднак у той момант, калі Дуда пакінуў будынак, туды зайшлі праваахоўнікі і затрымалі палітыкаў. У канцы мінулага месяца польскі акруговы суд вынес прысуд па справе Каміньскага і Вонсіка аб перавышэнні паўнамоцтваў, першае рашэнне па якім было вынесена ў 2015 годзе. Тады згодна з рашэннем суда, яны былі прыгавораны да двух гадоў турэмнага зняволення і пяцігадовай забароны на заняцце дзяржаўных пасад у сувязі з зямельным скандалам. Аднак перш чым прысуд стаў канчатковым, яны былі памілаваны прэзідэнтам Польшчы Анджэем Дудам. 9 студзеня польская паліцыя атрымала з суда дакументы, якія прадпісваюць узяць палітыкаў пад варту. Прэм'ер-міністр Дональд Туск заявіў на прэс-канферэнцыі, што рашэнне суда трэба безумоўна паважаць, і абвінавачаніў прэзідэнта Дуду ў тым, што ён дапамагае саюзнікам пазбегнуць правасуддзя.

Белы дом назвалі галоўным вінаватым у праблемах амерыканцаў

Праблемы грамадзян ЗША найперш звязаны з дзеяннямі палітыкаў у Белым доме. Пра гэта на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы заявіў экс-саветнік кіраўніка Пентагона палкоўнік Дуглас Макгрэгар. «Амерыканцы павінны ўсвядоміць, што людзі, якія зрабілі з імі гэта, знаходзяцца не ў Пекіне ці Маскве, яны знаходзяцца ў Белым доме», — заявіў Дуглас Макгрэгар. Ён таксама раскрытыкаваў празмерны аб'ём амерыканскага абароннага бюджэту. Па словах Макгрэгара, большая частка прадукцыі, якая вырабляецца ў Злучаных Штатах, — узбраенне, што з'яўляецца дрэнным знакам. Раней ён заяўляў, што Вашынгтон паставіў перад Кіевам невыканальную задачу і адправіў украінцаў на дакладную смерць. Ён назваў улады ЗША і прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага «цалкам адарванымі ад рэальнасці».

Турысты летась накідалі ў рымскі фантан Трэві манет на 1,6 мільёна еўра

Па традыцыі людзі адпраўляюцца на плошчу Трэві, каб кінуць манетку ў фантан і загадаць жаданне. «Гэта сотні і сотні еўра, якія тры ці больш разоў на тыдзень збіраюць спецыяльныя супрацоўнікі, аб якіх папярэджана мясцовая паліцыя, якая ахоўвае плошчу», — расказаў La Gazzettino Джусціна Трынчыа, дырэктар дабрачыннай рымскай арганізацыі Caritas, якая з 2006 года кіруе сродкамі, назапашанымі пасля збору ў фантане. Па яго словах, усяго ў 2022 годзе было сабрана больш за 33 тоны манет, што адпавядае больш за 1,4 мільёна еўра. Гэта стала рэкордам з таго часу, як дабрачынная арганізацыя кіруе сабранымі сродкамі. «Грошы выкарыстоўваюцца для дапамогі людзям, якія адчуваюць фінансавыя цяжкасці і якія пакутуюць на хваробу Альцгеймера», — распавёў Джусціна Трынчыа.

«ХАЧУ БЫЦЬ КАРЫСНЫМ...»

ШКОЛА ДУХОЎНАСЦІ

Пытанне — «Калі вы зразумелі, што ёсць Бог?» — ставіць яго ў тупік. Цяжка адказаць, калі ўсё сваё свядомае жыццё ён гэтым жыве.

— У нашай сям'і, як, напэўна, і ва ўсіх астатніх, было прынята на вялікія царкоўныя святы хадзіць у храм, — кажа Павел. — У гэтым мала сапраўднай веры, але добра, што хоць гэта прысутнічае ў жыцці. На Хрышчэнне вады набраць, на Вялікдзень асвяціць кулічы і яйкі, на Праабражэнне — яблыкі. Маці заўсёды так рабіла. Тата загінуў на рабоце, калі мне было ўсяго сем месяцаў. Але вакол мяне заўсёды былі блізкія людзі, і я ім за гэта ўдзячны.

Да царквы Павел далучыўся, калі ўжо вучыўся ў Шклоўскай спецыяльнай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку. Спачатку гэта былі баптысты. З прыяцелем яны хадзілі да іх некалькі гадоў. Калі ў школу прыйшла працаваць новая бібліятэкарка, усё змянілася.

Ірына Леанідаўна Майсеева, з якой суразмоўнік і цяпер не губляе сувязі, стала праводзіць факультатыўныя заняткі па асновах праваслаўнай веры. Яна цікава расказвала пра святых, на іх прыкладах дзеці вучыліся, як трэба жыць. Пасля школы Павел пайшоў вучыцца ў Гродзенскі медкаледж на масажыста. Разам з тым пасеянае ў сэрцы духоўнае зерне пачало расці. Ездзіў у паломніцкія паездкі, дзе адчуваў незвычайную радасць. Асабліва яму спадабалася ў Пачаеве. Таму, калі скончыў каледж, адразу ж падаў дакументы на завочнае аддзяленне Пачаеўскай духоўнай семінарыі.

ПА МАНАСТЫРСКІМ ЗВЫЧАІ

Пасля двух гадоў адпрацоўкі Паўла ў Магілёве ўжо нічога не ўтрымлівала. Два апошнія курсы ён вучыўся непасрэдна ў Пачаеве, дзе палюбіў манастырскія набажэнствы.

Маці на той час працавала ў Санкт-Пецярбургу і адтуль прывозіла сыну богаслужэбныя кнігі па Брайлю. А ён з захапленнем іх вывучаў. У Пачаеве малады чалавек умацоўваўся з дапамогай аскетыкі. Спачатку семінарысты жылі ў вялікіх шматлюдных памяшканнях. Потым быў перыяд, калі Паўла з яшчэ адным студэнтам пасялілі ў кватэры, якую прыхаджанка падарыла манастыру. Там царкоўнаслужыцелі-пачаткоўцы сутыкнуліся з варожа настроенай суседкай, якой яны перашкаджалі чытаннем акафістаў...

У Пачаеве Паўлу пашчасціла пець у хоры. Потым ён спяваў на клірасе ў адным з храмаў Магілёва. Пасля семінарыі вярнуўся на радзіму, але вучобу працягваў — ужо ў Кіеўскай духоўнай акадэміі, завочна.

Калі вучыўся ў акадэміі, пачаў служыць чытальнікам. У храме ў гонар святых праведных Іаакіма і Ганны ён пасябраваў з настаяцелем протаіерэем Георгіем Каралёвым і іерэем Аляксеем Скобам.

Вялікі ўплыў у свой час зрабіла на Паўла паездка ў Баркалабаўскі жаночы манастыр, што на Быхаўшчыне. Там у царкоўнай краме купіў ікону царскай сям'і. Доўга не мог зразумець, чаму яна ўвесь час вільготная. Было спякотна, і думаў, што ў яго пацеюць рукі. Але хутка высветлілася, што ікона міраточыла. Пэўны час Павел вазіў ікону па храмах, а потым перадаў яе ў той, дзе служыць цяпер. Ікона пабывала ў розных хрэсных ходах.

Быць свяшчэннаслужыцелем Паўлу не дазваляе адсутнасць зроку. Хоць, як ён кажа, выключэнні магчымыя. Адзін час у яго была мара стаць манахам, але потым жаданне прайшло.

У храме ён чытае Гадзіны, Апостал, Шастапсалміе — тое, што ёсць у кнігах, напісаных шрыфтам Брайля. Па даручэнні бацюшак часам звяртаецца да прыхаджан з пропаведдзю. Кажа, што яшчэ ў семінарыі на апошнім курсе ім даручалі чытаць пропаведзі, вучыцца даносіць Слова Божае да народа.

На яго погляд, пропаведзь павінна быць жывой і не вельмі доўгай, каб, як жартуюць царкоўнаслужыцелі, людзі не паспелі забыць да яе канца, пра што ішла гаворка ў пачатку. Але галоўныя абавязкі невідушчага клірыка — чытаць. А яшчэ ён з айцом Аляксеем перыядычна ездзіць у магілёўскую бібліятэку, дзе ёсць абанемент па абслугоўванні інвалідаў па зроку, на сустрэчы з чытачамі.

ПСІХОЛАГ З ПРАВАСЛАЎНЫМ УХІЛАМ

Наша сустрэча адбылася напярэдадні паездкі Паўла ў Санкт-Пецярбург. Ён студэнт трэцяга курса Рускай хрысціянскай гуманітарнай акадэміі імя Ф. Дастаеўскага

— Пасля Кіеўскай духоўнай акадэміі я некаторы час нідзе не вучыўся, і мне вельмі гэтага не хапала, — расказвае суразмоўнік. — Вырашыў вярнуцца да школьнай мары — пайсці вучыцца на псіхолага. Такі факультэт знайшоў у Маскоўскім праваслаўным інстытуце імя святога Іаана Багаслова. Але маці прапанавала падшукаць нешта ў Піцеры, дзе яна жыве. І я знайшоў. Рыхтаваўся ў паскоранным рэжыме — за месяц. Трэба было здаваць рускую мову, грамадазнаўства, біялогію, прычым дазвалялася зрабіць гэта анлайн. Галоўным для мяне было набраць прахадныя балы, і я іх набраў. Праграма вельмі насычаная: акрамя профільных прадметаў па псіхалогіі, шмат розных іншых, звязаных з філасофіяй, літаратурай, гісторыяй, правам, эканомікай і г. д. Дадаткова вывучаю базавую аналітычную псіхалогію ў Маскоўскім інстытуце псіхааналізу. Справа ў тым, што бакалаўрыят па асноўным месцы маёй вучобы дае магчымасць толькі выкладаць псіхалогію, а я хачу быць кансультантам. А курсы такую магчымасць даюць, хачу быць карысным. Калі хопіць сіл, пасля бакалаўрыята пайду ў магістратуру, дзе яшчэ два гады трэба будзе вучыцца. Там два кірункі — па псіхатэрапеўтычнай і псіхалагічным кансультаванні. Яшчэ не вызначыўся, што выбраць.

Падчас адной з сесій студэнты гуманітарнай акадэміі наведалі ў Санкт-Пецярбургу крызісны цэнтр 812, дзе працуюць у асноўным валанцёры. Яны кансультуюць людзей анлайн у інтэрнэце па прынцыпе тэлефона даверу. Перыядычна ўстанова праводзіць трэнінгі, дзе можна атрымаць магчымасць стаць валанцёрам-кансультантам. І Павел іх прайшоў. Ён дзяжурыў на лініі і 3 студзеня з 18.00 да 22.00.

— Людзей хвалююць розныя пытанні — ад працаўладкавання і сур'ёзных хвароб да наладжвання кантактаў з блізкімі, — расказвае

суразмоўнік. — Часта бяседы працягліся, таму ёсць абмежаванні да 50 хвілін. Пакуль валанцёр з кімсьці размаўляе, ніхто болей не можа дазваніцца. За 4 гадзіны максімум пяць чалавек паспяваю абслужыць. Але мы зацікаўлены дапамагчы як мага большай колькасці людзей. Наша задача — падтрымаць чалавека, каб не сышоў у крызіс.

Павел раіць запомніць карысны рэсурс. Трэба ў пошукавым радку набраць «крызісны цэнтр 812», і там будзе ўся інфармацыя. Лінія бясплатная, працуе з 18.00 да 2 гадзін ночы.

«На зямлю прыходзіць Бог, каб выратаваць усіх людзей. Прымае вобраз чалавека, становіцца Немаўлём, такім чынам змяраецца. Прыходзіць не ў царскія палацы, а ў хлеў. У свеце не знайшлося іншага месца для Дзевы Марыі. Наогул, той перыяд нараджэння Хрыста быў насычаны рознымі падзеямі. У тым ліку і такімі трагічнымі, як забойства дзяцей царом Ірадам. Таму ў гэтыя дні варта імкнуцца да стрыманасці і духоўнай радасці, наведваць блізкіх, тых, каму патрэбна наша ўвага, хто хоча мець з намі стасункі. Тады адчуеш, што неба наблізілася да зямлі і Бог сышоў да нас».

КАПІТАН КАМАНДЫ «АЛЬТАІР»

У пакоі Паўла ўсе сцены застаўлены кнігамі і іконамі. Як ён прызнаецца, на жаль, не ўсе патрэбныя яму кнігі ёсць у электронным выглядзе. Тады ён купляе звычайныя і з дапамогай сканера пераводзіць іх у электронны варыянт. А вось «фаліянты» ў абгортках са звычайнага кардону — гэта кнігі па Брайлю. Яны вельмі аб'ёмныя. Новы Запавет у 7 тамах.

— На выданні такіх кніг спецыялізуецца Санкт-Пецярбургскае выдавецтва «Чытанне», — расказвае Павел. — Для сябе я там заказваю часопісы «Веды», «Культура і здароўе», «Маладзёжны форум», «У свеце музыкі». Падабаецца чытаць пра кампазітараў, выканаўцаў, музычныя падзеі. Потым я ўсё гэта перадаю ў бібліятэку.

Чытанне дапамагае Паўлу яшчэ ў адным яго захапленні. У інтэрнэце ён знайшоў праграму, дзе шмат чатаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У тым ліку і для аматараў інтэлектуальных гульняў. І там існуе цэлая сістэма, створаны каманды, якія гуляюць у фармаце «Што? Дзе? Калі?» Павел — капітан каманды «Альтаір», якая існуе ўжо шэсць гадоў.

— Усе гульцы пішуць пытанні і скідваюць іх вядучай, — расказвае ён прынцып узаемадзеяння. — Сезон пачынаецца ў верасні і заканчваецца ў чэрвені, кожная каманда паспявае сыграць раз сем. Мы гуляем на пытаннях іншых каманд, камусьці трапляюць нашы. Гэтыя гульні трансліруюцца па спецыяльнай радыёстанцыі па пятніцах. А па нядзелях раз на два тыдні праходзяць сінхронныя радыёгульні, калі адзін аўтар піша пакет з 24 пытанняў, а астатнія каманды гуляюць на гэтыя пытанні, у тым ліку і каманда аўтара, акрамя, вядома, яго самога. Пад канец сезона падводзяцца вынікі, хто на якім месцы. Мы звычайна займаем 4—5-е, але было, што вырываліся і на трэцяе. Пытанні вельмі сур'ёзныя, магчыма, не хапае ведаў. Мне як капітану трэба быць больш адукаваным у розных галінах.

БЫЎ ДЗЕДАМ МАРОЗАМ

«Ці цяжка вам уявіць той свет, які вы не бачыце? Той жа фільм паглядзець?» — задаю няпростае пытанне.

— Калі няма гукаў, цяжка, але не катастрафічна, — адказвае Павел. — Я наогул мала фільмаў «гляджу». Невідушчыя таксама выкарыстоўваюць гэты тэрмін. Уключаецца ўяўленне, і ты бачыш нейкія вобразы. Асабліва добра ўспрымаюцца фільмы, дзе шмат дыялогаў, гукаў. Апошнія пяць гадоў актыўна развіваецца такая рэч, як тыфлакаментарый да фільма. Але гэта больш у Расіі, там да праблемы сур'ёзна падышлі.

Насамрэч мне больш падабаецца тэатр. Калі пазнаёміўся з артыстамі Магілёўскага драмтэатра Аленай Дудзіч, Рыгорам і Яўгеніяй Белацаркоўскімі, амаль увесь рэпертуар пераглядзеў. Вельмі ўразіў спектакль «Аднакласнікі» па п'есе Юліі Чарняўскай «Літаркі». Я потым хацеў знайсці тэкст п'есы і перачытаць. Спадабаўся спектакль «З любоўю не жартуюць». А яшчэ «Гэтыя свабодныя матылькі», там герой невідушчы. У школе я і сам іграў у тэатры. Мы ставілі шмат чаго, і я актыўна быў заняты, нават на галоўных ролях. Аднойчы на навагоднім ранішніку быў Дзедам Марозам, і мяне ніхто не пазнаў, нават дырэктар.

«СЛЕПАТА МНЕ НА КАРЫСЦЬ»

Павел кажа, што ніколі ні на хвілінку не сумняваўся, што Бог існуе. Вера ратуе ад крызісаў. Прызнаецца, што вельмі выразна адчуў прысутнасць Бога ў Іерусаліме.

— Асаблівае дзеянне на мяне зрабіў храм Гроба Гасподняга, — расказвае ён. — Людзей у Кувуклію было шмат, ахоўнікі прымушалі ўсіх хутка рухацца, грукалі палкамі. Я вельмі хваляваўся, але, калі зайшоў унутр, падалося, што ўвесь свет кудысьці сышоў. Я адчуў, што Бог побач. Мне было так хораша і спакойна. Прамільгнула думка пра зрок. Хацеў зразумець, чаму яго няма. Падумаў, што ён з'явіцца, як толькі прыкладуся да Гроба. Але пачуў унутры сябе голас: «Табе гэта не патрэбна, табе і без гэтага будзе добра». І мяне гэта натхніла. Я выйшаў шчаслівы і супакоены. Мае знаёмыя толькі здзіўляліся, чаму ахоўнікі мяне не прыспешвалі. Наогул у той паездцы мне было камфортна, нягледзячы на тое што я спякоту не пераношу. І я імкнуўся ўсім тым, што там было, прасякнуцца.

Калі вучыўся ў Пачаеве, наведаў пячорку Іава Пачаеўскага. Вельмі вузкі праём, няма дзе развярнуцца. Людзі ідуць туды памаліцца, атрымаць дапамогу. Звычайна туды збіраецца чарга, але мне пашчасціла прыйсці, калі нікога не было. І мне дазволілі застацца там на некаторы час. Была ўрачыстая цішыня, прыемны пах. Калі я выйшаў, думаў, што прабыў некалькі хвілін. Але маці сказала, што я быў там гадзіну. І мне стала зразумела, як святыя маглі праводзіць дні і ночы ў малітвах і не стамляцца. Ёсць такая фраза, што для Бога адзін дзень як тысяча гадоў і тысяча гадоў як адзін дзень. Заўсёды задумваўся над ёй. А тут нечакана для сябе зразумеў.

СВЯТЫЯ ВЕЧАРЫ

Гэта асаблівы час, калі вельмі важна паразважаць над рознымі падзеямі, лічыць Павел.

— На зямлю прыходзіць Бог, каб выратаваць усіх людзей, — кажа ён. — Прымае вобраз чалавека, становіцца Немаўлём, такім чынам змяраецца. Прыходзіць не ў царскія палацы, а ў хлеў. Там, дзе холадна, дзе жывёлы. У свеце не знайшлося іншага месца для Дзевы Марыі. Наогул, той перыяд нараджэння Хрыста быў насычаны рознымі падзеямі. У тым ліку і такімі трагічнымі, як забойства дзяцей царом Ірадам. Таму ў гэтыя дні варта імкнуцца да стрыманасці і духоўнай радасці, наведваць блізкіх, тых, каму патрэбна наша ўвага, хто хоча мець з намі стасункі. Тады адчуеш, што неба наблізілася да зямлі і Бог сышоў да нас.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Экабяспека

СПАЛІЦЬ, ЗАБАРАНІЦЬ, АБМЕЖАВАЦЬ?

Што рабіць з пластыкавымі адходамі

Згодна з данымі Інстытута ЖКГ НАН Беларусі, у нашай краіне штогод утвараецца каля 300 тысяч тон палімерных адходаў (і гэта толькі 8 працэнтаў ад агульнага аб'ёму смецця, якое «вырабляюць» беларусы). У 2022-м было сабрана і адпраўлена на перапрацоўку звыш 106 тысяч тон пластыку, хоць магутнасці па яго перапрацоўцы ў краіне дазваляюць выкарыстоўваць прыкладна 143 тысячы тон у год. Чаму магчымасцяў шмат, а рэалізуюцца яны не напоўніцу? І ці можна знайсці паміж імі баланс, а заадно паменшыць аб'ёмы пластыкавага смецця ў краіне, расказалі эксперты.

ШМАТСЛОЙНЫЯ ПЛЁНКІ І ТАРА СА ШКЛАБОЮ

У рэестры аб'ектаў па выкарыстанні адходаў зарэгістравана каля 170 аб'ектаў, якія займаюцца менавіта пластыкавымі адходамі, у тым ліку адходамі, якія вымаюцца з агульнай масы цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). У асноўным перапрацоўка такіх адходаў заключаецца ў вырабе з іх гранул і чыпсаў, з якіх у сваю чаргу ствараюцца вырабы з пластыку. А вось гэтым займаюцца фактычна два прадпрыемствы: «Белдруглалімер» у Гродне і Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў, агульная магутнасць якіх — каля 10 тысяч тон у год.

— Апошнім часам распаўсюджваюцца так званыя шматслойныя бар'ерныя плёнкі: поліамід, поліэтылен і ПЭТ-поліэтылен. Пластмасы становяцца шматкампанентнымі — для патаннення вытворцы пачынаюць дадаваць у іх мел, тальк і іншыя кампаненты. У выніку іх перапрацоўка становіцца праблемнай ці ўвогуле немагчымай. Застаецца толькі спальваць такія адходы, бо іншых варыянтаў па перапрацоўцы пакуль не існуе. Самае актуальнае сёння рашэнне — забараніць выраб такіх відаў плёнкі, магчымасць перапрацоўваць якія цяпер адсутнічае, — расказаў **Максім БЯСПАЛЫ, намеснік начальніка ўпраўлення па абыходжанні з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі таварыства «Белрэсурсы»**.

Ён нагадаў таксама пра неабходнасць забароны імпарту ўпакоўкі з палімераў, якія не перапрацоўваюцца. А таксама забароны выкарыстання на ўпакоўках этыкетак ПВХ, наяўнасць якіх на тары забруджвае адходы для перапрацоўкі, псуе абсталяванне і ўскладняе далейшае выкарыстанне палімераў і гранул, якія атрымліваюцца з пластыку пасля перапрацоўкі.

— «Белрэсурсы» прымаюць актыўны ўдзел у павелічэнні вырабу экалагічна бяспечнай тары са шкла — займаюцца сарціроўкай і ачысткай змешанага шклабою. Аднак, на жаль, у 2023-м намецілася тэндэнцыя змяншэння паступлення на вытворчы ўчастак прадпрыемства адходаў шкла ад юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца нарыхтоўкай, — заўважыў спецыяліст. — Сёння ў Беларусі зарэгістравана 26 аб'ектаў па выкарыстанні адходаў шкла, аднак большая частка з іх не маюць магчымасцяў забяспечыць ачыстку і сарціроўку шклабою перад пастаўкай яго прадпрыемствам «Белрэсурсаў» па вырабе тары. Пэўна, трэба больш патрабавальна падыходзіць да ўключэння падобных суб'ектаў у рэестр перапрацоўшчыкаў.

Увядзенне забароны на выкарыстанне этыкетак ПВХ на вырабах з поліэтылентэрэфталату (ПЭТ-бутэльках) было адной з ініцыятыўных прапаноў Беларусі ў Тэхнічны рэгламент Мытнага саюза «Аб бяспецы ўпакоўкі». Новаўвядзенне падтрымалі ўсе дзяржавы Саюза, так што такая забарона ўжо ёсць. Калі Тэхрэгламент пройдзе ўнутрыдзяржаўнае ўзгадненне, забарона будзе ўведзена, пракаментаваў гэтую думку **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Яшчэ адной ініцыятывай Беларусі і Мінпрыроды ў рамках стратэгічных кірункаў развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза да 2025 года стала правядзенне навукова-даследчай работы па забароне на ўвоз і вытворчасць пэўных відаў пластыкавых вырабаў, у тым ліку аднаразовых. Па выніках гэтай работы падрыхтаваны і зараз разглядаецца даклад, дзе прапанаваны розныя шляхі па абмежаванні вытворчасці і ўвозу такіх пластыкавых вырабаў. Што датычыцца шматслойнай упакоўкі тыпу тэтрапак і пюрпак, якая не перапрацоўваецца, то ў 2022 годзе ў рэестры аб'ектаў зарэгістраваны два аб'екты двух суб'ектаў гаспадарання, якія прымаюць на выкарыстанне такія віды адходаў. На астатнія віды будзем улічваць вашы прапановы.

«ПЛАСТЫКАВЫЯ» СТАНДАРТЫ І ПАТРАБАВАННІ

Некаторыя віды пластыку раскладаюцца цягам тысячы гадоў, так што такі від адходаў небяспечны сам па сабе, таму задача чалавецтва — мінімізаваць аб'ёмы іх утварэння, асабліва тых відаў, якія пакуль не перапрацоўваюцца. У Беларусі, у прыватнасці, у рамках рэалізацыі плана мерапрыемстваў, скіраваных на паэтапнае змяншэнне выкарыстання паліпрэнай упакоўкі з яе замяшчэннем экалагічна бяспечнай, адзін з пунктаў датычыцца распрацоўкі стандартаў на аснове міжнародных патрабаванняў. Для яго рэалізацыі распрацавана праграма стварэння дзяржаўных стандартаў на аснове міжнародных, якая комплексна разглядала пытанні і розныя аспекты біяраскладальнасці ўпакоўкі, расказаў **Аляксандр СКУРАТАЎ, дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС)**:

— У мэтах праграмы, якая цяпер цалкам выканана, распрацаваны 41 стандарт. Пры гэтым яна працягваецца ў рамках рэалізацыі патрабаванняў тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза.

У стандартах, якія пацвярджаюць біяраскладальнасць пластмас у розных умовах, прыведзены методыкі ацэнкі якасці кампосту, які атрымліваецца, у тым ліку наяўнасці рэгламентаваных металаў і іншых шкодных прымесяў. Частка стандартаў па біялагічным раскладанні ўведзены ў красавіку 2021 года, частка — з 1 верасня 2022-га. Група стандартаў звязана з прымяненнем пластмас, праблемай іх перапрацоўкі і захавання. Дзеля змяншэння нагрузкі на наваколле шляхам памяншэння ўтварэння адходаў упакоўкі планам прадугледжана таксама распрацоўка стандартаў на кантэйнеры шматразовага выкарыстання. Стандарты па паўторным выкарыстанні ўпакоўкі ўведзены з мая 2022-га.

Яшчэ адна група стандартаў, якія ўступілі ў сілу з сакавіка 2023-га, — мяхі і мяхі-ўкладышы, якія прымяняюцца для збору бытавых адходаў з улікам спосабу, якім іх далей утылізуюць. Стандарты вызначылі патрабаванні як да саміх мяхоў, так і да біяраскладальнасці. Чарговая група стандартаў звязана з мінімізацыяй шкоднага ўздзеяння на атмасфернае паветра, водныя аб'екты, глебу, магчымыя наступствы для здароўя чалавека. Стандарты, якія пачалі працаваць з 1 верасня 2022-га, вызначылі найбольш важныя паказчыкі якасці; адпаведныя метады выпрабаванняў партый другасных полістыролу, поліэтылену, прапілену і іншых матэрыялаў, якія прымяняюцца пры вырабе паўфабрыкатаў і гатовай прадукцыі, а таксама працэдуры, неабходныя для забеспячэння прасочвальнасці перапрацаваных пластмас.

Стандарты па ўліку экалагічных аспектаў пры вызначэнні патрабаванняў да ўпакоўкі, скіраваныя на мінімізацыю любога неспрыяльнага ўздзеяння на наваколле, пачалі дзейнічаць з 1 верасня 2022 года.

— Для развіцця вырабу ўпакоўкі з матэрыялаў, якія падлягаюць перапрацоўцы, і ўніфікацыі патрабаванняў да яе распрацавана больш як дзесяць дзяржстандартаў, якія ўступілі ў сілу 1 сакавіка 2023-га, — дадаў Аляксандр Скуратаў. — А ў праграму распрацоўкі дзяржстандартаў, якія забяспечваюць рэалізацыю патрабаванняў тэхрэгламента Мытнага саюза, уключана сем міждзяржаўных стандартаў на базе дзяржстандартаў Беларусі. Такім чынам, работа, выкананая на нацыянальным узроўні, знаходзіць адлюстраванне на ўзроўні краін пяцёркі і пераходзіць у разрад абавязковых патрабаванняў.

ДЫСБАЛАНС МАГЧЫМАСЦЯЎ І АБ'ЁМАЎ

Дысбаланс паміж аб'ёмам магчымасцяў перапрацоўкі і памерамі рэальнай перапрацоўкі смецця мае тлумачэнні. У большасці прадпрыемствы перапрацоўваюць чыстыя вытворчыя адходы. А вось у дачыненні тых пластыкавых адходаў, што вымаюцца з ЦКА, трэба нарошчваць магутнасці, заўважыў **Іван БАРАНОЎСКІ, намеснік дырэктара па навуцы Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі**:

— З іншага боку, магілёўскі завод, які перапрацоўвае ПЭТ-бутэльку, можа павялічыць свае магутнасці, бо не задзейнічаны на 100 працэнтаў — не хапае збору прадукцыі для перапрацоўкі. Вызначыць жа баланс, хто толькі чыстыя вытворчыя адходы перапрацоўвае, а хто камунальныя — складана. Вось і атрымліваецца, што адно прадпрыемства недагружанае, а іншае не можа перапрацаваць.

Камунальныя адходы настолькі разнасортныя, што нават калі мы іх умоўна рассартыруем (пластык да пластыку, шкло да шкла), то яны будуць мець і розны колер, і састаў, і якасць, таму і складана будзе іх перапрацоўваць, заўважыў **Валерый ГАНЧАРОЎ, дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі**:

— Можна іх, напрыклад, паліць, але паліць правільна. У Акадэміі навук ёсць плазмавыя тэхналогіі, якія, па сутнасці, раскладаюць рэчыва да атамарнага складу. Тым самым мы атрымліваем адносна чыстую энергію і пазбаўляемся ад рэчаў, якія вельмі складана адсартаваць. Тэхналогіі на аснове плазменнага гарэння для перапрацоўкі шын, напрыклад, паспяхова працуюць. Магчыма, трэба тыражыраваць гэты правільны вопыт.

Такім чынам, відавочна, што цалкам адмовіцца ад пластмасавых вырабаў і ўпакоўкі чалавецтва не можа, але можа пастарацца максімальна карыстацца «добрым» пластыкам, які прыдатны да перапрацоўкі. А яшчэ — варта кожнаму рацыянальна ставіцца да колькасці ўжывання пластыкавых вырабаў і спадзявацца, што з часам вынайдуць новыя экалагічныя спосабы выкарыстоўваць тое, што пакуль перапрацаваць немагчыма.

Ірына СІДАРОК.

Падзея

Брэстчына чакае гасцей

Прэзентацыя вобласці пачынаецца сёння на ВДНГ у Маскве

Дні Брэсцкай вобласці адкрываюцца сёння (11 студзеня) на Маскоўскай міжнароднай выставе-форуме «Расія» на ВДНГ, паведамілі ў Брэсцкім аблвыканкамае. Любы ахвотны можа наведаць экспазіцыю і азнаёміцца з эканамічным, культурным, турыстычным патэнцыялам. Асобныя экспазіцыі падрыхтавалі Нацыянальны парк «Белавежская пушча», Брэсцкая крэпасць, СЭЗ «Брэст».

Палац спорту «Вікторыя».

Супрацоўнікі нацыянальнага парку раскажуць гасцям пра самы старажытны лес еўрапейскага кантынента, дзе расце каля дзвюх тысяч дрэў-веліканаў, многія з якіх з'явіліся яшчэ да адкрыцця Калумбам Амерыкі. Раскажуць пра самую вялікую ў свеце папуляцыю зубра і іншыя цікавосткі загадкавай пушчы. Мабыць, не ўсе ведаюць, што рэзідэнцыя беларускага Дзеда Мароза знаходзіцца ў векавым лесе, на самым поўдні краіны. Дарэчы, на стары Новы год беларускі Дзед Мароз наведае выставу, сустрэне гасцей Брэстчыны на гэтым форуме. Тады ж будуць працаваць майстры народнай творчасці, якія падрыхтавалі для наведвальнікаў шмат сюрпрызаў.

На прэзентацыі горада Брэста раскажуць пра тое, што тут упершыню на тэрыторыі Беларусі з'явіўся свой манетны двор, а таксама свая друкарня, дзе была надрукавана Брэсцкая Біблія. Прапануюць невялікую віртуальную экскурсію па ўнікальным музеі старажытнага ўсходнеславянскага горада, помніку абарончага дойлідства Камянецкай вежы, раскажуць пра палацавы комплекс у Ружанах, Косаўскі палац, музей касманаўтыкі. Госці даведаюцца пра спартыўныя аб'екты сусветных стандартаў, пра тое, што Брэст — радзіма міжнародных фестываляў — тэатральнага мастацтва «Белая Вежа» і класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары».

Як падкрэсліваюць у прэс-службе Брэсцкага аблвыканкама, адзін з найважнейшых раздзелаў выставы прадстаўляе сельскую гаспадарку вобласці. Гасцям пакажуць дасягненні аграрыяў і найлепшыя прадукты вытворцаў рэгіёна. А паказаць ёсць што. Рэгіён забяспечвае чацвёртую частку прадукцыі жывёлагадоўлі ў краіне. Брэстчына — традыцыйны лідар па аб'ёмах экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны, забяспечвае яго трэцюю частку. На экспарт адгружаецца 75 працэнтаў выпушчанай малочнай прадукцыі, 40 працэнтаў — мясной, па 30 працэнтаў — натуральнамалочных прадуктаў і каўбасных вырабаў. Прадукцыю аграрыяў і перапрацоўшчыкаў Брэстчыны купляюць амаль у 60 краінах свету.

Прамысловы патэнцыял будзе паказаны ў асноўным праз вытворцаў свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». Падрыхтаваны стэнды прадпрыемстваў, якія выпускаюць будаўнічыя матэрыялы, адзенне, абутак, прадукты харчавання, бытавую тэхніку. З дзейнасцю прадпрыемстваў можна азнаёміцца з дапамогай інтэрактыву, відэаролікаў.

На Брэстчыне заўсёды рады гасцям. Штогод рэгіён наведвае больш за 1 мільён 600 тысяч турыстаў. Даведацца пра гэта, атрымаць дадатковую інфармацыю на розныя тэмы можна да закрыцця выставы, якое запланавана на 29 студзеня.

У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця дзён Брэсцкай вобласці чакаецца ўдзел Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя КРУТОГА, Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі Дзмітрыя МЕЗЕНЦАВА, старшыні Брэсцкага аблвыканкама Юрыя ШУЛЕЙКІ.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
11 СТУДЗЕНЯ 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15969)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Таццяна ПРАХАРЭНКА:

«Часам я магу паводзіць сябе як абсалютная авантурыстка»

Гэтая дзяўчына — не толькі ўладальніца моцнага голасу і яркай знешнасці. Яна з ліку тых, хто ўмее дасягаць пастаўленых мэт і дакладна ведае, чаго хоча ад жыцця. Шырокай публіцы наша гераіня вядомая па тэлевізійных шоу, а прыхільнікам Гомельскай філармоніі — як салістка Эстрадна-сімфанічнага аркестра імя Ю. А. Васілеўскага. Напрыканцы года мы сустрэліся з Таццянай Прахарэнкай, каб распытаць пра пераадоленне сябе, пра музыку і яе ўспрыманне ў розных кантэкстах, а таксама пра тое, што рухае і натхняе артыстку кожны дзень.

— Таццяна, я назіраю за вамі з самага першага сезона шоу «Фактар.by», і складваецца ўражанне, што вы баец. Гэтая рыса характару ў вас заўсёды была ці з'явілася з вопытам?

— Я сама не лічу, што з'яўляюся байцом, бо зусім па-іншаму сябе ацэньваю. На праекце ні з кім не спаборнічала і ў прынцыпе па жыцці ўсё вельмі лёгка ўспрымаю. Я прафесійная вакалістка, таму пайсці на «Фактар.by» і там заявіць пра сябе — гэта не было для мяне такім складаным крокам, як, напрыклад, для людзей, хто ніколі на сцэну не выходзіў. Я ж усё ўспрымала як падзею, дзе за кошт сваёй працаздольнасці ты можаш выканаць пастаўленыя задачы, але без усялякай барацьбы з сабой, іншымі ўдзельнікамі. Для мяне існавалі толькі дакладна пастаўленыя тэхнічныя заданні, і была задача іх выканаць, з чым я ўдала спраўлялася.

— Пасля вы сталі ўдзельніцай праекта «Героі. Перазагрузка». Што новага пра сябе даведаліся там?

— Мяркую, гэта была адна з самых жорсткіх праверак мяне на трываласць за ўсё маё жыццё. Да праекта я паставілася па-філасофску ўжо пасля яго заканчэння, бо там змагла пражыць тыя рэчы, якія, думала, немагчыма пераадолець. Напрыклад, самым складаным для мяне было выпрабаванне стыхіяй паветра. Аказалася, я баюся вышыні, прычым нават не магу глядзець на людзей, калі яны там знаходзяцца. Аднак такі экзамен выпаў на мой лёс, і давялося псіхалагічна прыкласці неймаверныя высілкі, каб прайсці яго. І гэты крок стаў для мяне вырашальным. Зразумела, што немагчымае магчыма.

— Скажыце, ці лёгка вам удаецца прымаць важныя рашэнні ў жыцці?

— Часам я магу паводзіць сябе як абсалютная авантурыстка. А некаторыя свае крокі доўга абдумваю, узважваючы ўсе «за» і «супраць». Аднак мне лёгка ўдаецца прымаць тыя сітуацыі, на якія я не здольная паўплываць. Калі ж выбар залежыць ад мяне, то тады ўжо доўга пакутую, прымаючы рашэнне.

— Калі вы вярталіся на «Фактар.by» ў другім сезоне, ці не шкадавалі, што давядзецца ўсё пачынаць спачатку?

— З першага сезона гэты праект даволі нечакана ўвайшоў у маё жыццё, бо кастынг на яго я праходзіла яшчэ ў дазпідэмічны перыяд. Таму спачатку ішла на яго проста з думкай «паеду, пагляджу, што там, і атрымаю задавальненне». А вяртаючыся ў другім сезоне на шоу, сутыкнулася з вялікай колькасцю асуджэння з боку майго акружэння. Гэта прымусіла падумаць, ці правільна я рабіла раней. Аднак у першым сезоне, калі стаяла на сцэне і павінна была агучыць сваё рашэнне ісці далей, то разумела, што зараз скажу на ўсю краіну «не», а потым усё ж вярнуся ў другім сезоне. Мне гэта здавалася цікавым піяр-ходам.

— Зараз на праекце вы — выкладчык па вакале. Як вам у такой ролі?

— Прэстыжна, хвалююча, але я дастаткова ўпэўнена ў сваім прафесійным узроўні. Ведаю, што магу даць і чаго ад мяне хочуць, таму адчуваю сябе камфортна. На праекце выступаю, нібы нейкі праваднік паміж настаўнікамі і ўдзельнікамі. Мая задача не проста навучыць герояў прафесійным вакальным звычкам (усе ўдзельнікі вельмі моцныя ў гэтым), а ў тым ліку і накіраваць іх у плане нейкіх эмоцый, падказаць манеру паводзін. Увогуле, я дамагаю ім усім, чым магу.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Дакрануцца да гісторыі

ШАНС ПАТРАПІЦЬ У ІНШУЮ ЭПОХУ

І ўзнавіць падзеі таго часу

Ганна РОВІНА састаіць ў сталічным клубе ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Фузілеры-грэнадзёры Імператарскай Гвардыі». У гэтай сферы дзяўчына каля пяці гадоў. Яна падзялілася, што сабой уяўляе такая дзейнасць як рэканструкцыя гістарычных падзей, і расказала, чаму ёй варта ўдзяліць увагу. Па словах суразмоўніцы, усё пачалося з таго, што яе малады чалавек, які таксама займаецца рэканструкцыяй, прапанаваў дзяўчыне разам пайсці на адно з такіх мерапрыемстваў.

— Гэта быў грамадскі баль у Барысаве. Больш за ўсё мяне ўразіў той факт, што, наведваючы падобныя мерапрыемствы, я магу перамяшчацца ў зусім іншыя эпохі. Здзівіла таксама маштабнасць таго, што адбываецца. На балі былі як людзі, што маюць дачыненне да рэканструкцыі, так і проста гледачы. Так я ў свой першы раз патрапіла ў асяроддзе тых, хто ўзнаўляе падзеі мінулага — было вельмі прыемна адчуваць сябе разам з імі.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Свой выбар

ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

І тады будзе аддача ад дзяцей і падзяка ад бацькоў

Лізавета САМСАНОВІЧ працуе лагапедам-дэфектолагам у дзіцячым садку № 20 Брэста. Цяпер яна цалкам задаволена сваім жыццём і адчувае, што знайшла сябе ў гэтай сферы. Праўда, калі ў старэйшых класах дзяўчына вельмі захапілася псіхалогіяй, пра спецыяльнасць лагапеда і гаворкі не было. Але, як гэта часта бывае з абітурыентамі, бацькоўскае слова адыграла вырашальную ролю.

— Мама сказала, што лепш ісці на лагапеда: там графік больш зручны, а ў будучыні для жанчыны і маці гэта важна, — успамінае суразмоўніца.

Лізавета даведалася больш інфармацыі пра спецыяльнасць і ў выніку вырашыла ўсё ж такі паспрабаваць. Да таго ж пералік дысцыплін на ЦТ пры паступленні на псіхолага і на лагапеда-дэфектолага нічым не адрозніваўся. І вось у 2016 годзе дзяўчына стала студэнткай БрДУ імя А. С. Пушкіна па спецыяльнасці «настаўнік-лагапед, выкладчык».

Вучоба ва ўніверсітэце Лізавеце падабалася. Вялікае задавальненне і шмат ведаў атрымала ад практык у дзіцячых садках. Яна сябе і настройвала, што першае месца працы будзе абавязкова ў дзіцячым садку з малымі.

Але жыццё ўнесла свае карэктывы, і, калі прыйшоў час размеркавання, жаданых вакансій не было.

— Толькі з'явіцца вольнае месца ў дзіцячым садку — яго тут жа займаюць, — успамінае Лізавета.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

11 01 2024 г.

У ліку найлепшых

ТАЛЕНТЫ З АКАДЭМІІ НАВУК

Рашэннем Бюро Прэзідыума НАН Беларусі зацверджаны спіс лаўрэатаў штогадовага конкурсу «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» за 2023 год. У дакумент патрапілі імёны сямі маладых вучоных.

Штогадовы конкурс «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» заснаваны ў 2018 годзе. Агульная колькасць маладых вучоных, якія адначасова ўваходзяць у банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», не можа перавышаць 100 чалавек, а штогадовая колькасць лаўрэатаў конкурсу — не больш за 20 чалавек. Знаходжанне ў банку даных кандыдатаў навук — да дасягнення імі 35-гадовага ўзросту, дактароў навук — да 45 гадоў.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца кандыдаты навук ва ўзросце да 30 гадоў і дактары навук ва ўзросце да 40 гадоў, якія працуюць у арганізацыях НАН Беларусі. Лаўрэаты конкурсу ўключаюцца ў банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (з выдачай адпаведнага сертыфіката) і ў рэзерв кіруючых кадраў НАН Беларусі, атрымліваюць штогадовы грант на ўдзел у міжнародным навуковым, навукова-арганізацыйным або навукова-практычным мерапрыемстве (канферэнцыі, сімпозіумы, навуковыя школы, кароткатэрміновыя стажыроўкі і іншых) і штогадовую прэмію ў памеры да 7 базавых ставак у перыяд увахо джання ў банк даных.

Мэта конкурсу «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» — рэалізацыя мер па прыцягненню і замацаванню таленавітай моладзі ў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сферах; стварэнне маладзёжных навукова-даследчых груп і амаладжэнне кадравага саставу навуковых арганізацый; забеспячэнне пераемнасці паміж вучонымі розных пакаленняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Крок да прафесіі

У ПРАКУРОРЫ СА... ШКОЛЬНАЙ ЛАЎКІ

Адпаведная форма, веданне законаў і павышаная адказнасць — усё гэта цяпер уласціва навучэнцам 10 «А» класа дзяржынскай гімназіі № 1, бо літаральна нядаўна яны сталі другім у Беларусі класам пракурорскай накіраванасці. Аб тым, як прайшло пасвячэнне і якія эмоцыі зведалі навучэнцы, мы даведаліся на месцы падзей.

Першыя пажаданні вучні атрымалі асабіста ад **Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Андрэя ШВЕДА:**

— Зараз мы праводзім акцыю, у рамках якой у кожным рэгіёне адкрываем спецыялізаваныя класы «Юны пракурор». Спадзяемся, што падчас вучобы ў вас з'явіцца разуменне, што такое пракуратура, чым займаюцца пракуроры, што ў далейшым абумовіць ваш выбар прафесіі. Для нас вельмі важна, каб праз гэтыя спецыялізаваныя класы можна было данесці да дзяцей любоў да Радзімы, патрыятызм, пачуццё адданасці свайму народу і сваёй справе.

Сваё меркаванне выказаў таксама **пракурор Дзяржынскага раёна Уладзімір НЕПАДКУПНЫ:**

— Стварэнне такога класа ў нашым раёне — гэта вялікі гонар. Для яго навучэнцаў цяпер адчынены дзверы на мноства мерапрыемстваў і сустрэч, якія як пракуратара Дзяржынскага раёна, так і Генеральная пракуратура будуць арганізоўваць для дзяцей. Акрамя гэтага, мы цяпер абмяркоўваем магчымую дапамогу пры паступленні выпускнікоў прафільнага класа на юрыдычныя спецыяльнасці. Спадзяемся, што вучоба ў класе «Юны пракурор» для гімназістаў стане не толькі новай адказнасцю, але і пуцёўкай у будучыню.

— Нам хацелася, каб, выходзячы са сцен гімназіі, дзеці былі не толькі адукаваныя, таленавітыя, але каб яны сталі сапраўднымі грамадзянамі нашай краіны, — адзначыў **дырэктар гімназіі Валерый СКУРАТОВІЧ.** — Я рады і вельмі ганаруся, што менавіта хлопцы і дзяўчаты нашай гімназіі атрымалі такую магчымасць і сталі другім класам ва ўсёй краіне з такой накіраванасцю. Калі нам паступіла адпаведная прапанова з аддзела адукацыі, не ўтойваю, было невялікае хваляванне, але дзякуючы дапамозе адміністрацыі раёна і супрацоўнікаў пракуратуры мы ўжо пачалі паспяховую работу з навучэнцамі і наведалі некалькі мерапрыемстваў, якія пакінулі свой след у іх душах. У новы профільны 10 клас было залічана трыццаць чатыры вучні. Усе — з добрымі адзнакамі па вучэбных прадметах. А профільнымі прадметамі, якія школьнікі вывучаюць паглыблена, з'яўляюцца грамадазнаўства і англійская мова. Навучанне ў прававым класе дасць дзецям магчымасць лепш разбірацца ў розных бытавых сітуацыях, падзеях, што адбываюцца вакол нас, і даваць ім правільную прававую ацэнку.

Пасля прадстаўнікі пракуратуры Мінскай вобласці і раёна, упраўлення па адукацыі, спорту і турызму Дзяржынскага райвыканкама і дырэктар гімназіі № 1 падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве і ўрачыста пасвяцілі гімназістаў у навучэнцы класа «Юны пракурор». Далей усе ўдзельнікі свята наведалі падрыхтаваныя выставы і экспазіцыі ваенна-патрыятычнай накіраванасці, а хлопцы і дзяўчаты і іх класны кіраўнік падзяліліся з карэспандэнтам «Чырвонкі. Чырвонай змены» сваімі ўражаннямі.

— Я вельмі рада і ганаруся быць кіраўніком класа такога кірунку, — расказвае **Тамара ДЗЯРЖЫНСКАЯ, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства.** — Я адразу правяла з гімназістамі гутарку і патлумачыла ўсю значнасць і адказнасць іх новага статусу. Упэўнена: яны не падвядуць нас! Бо кожны з іх унікальны і індывідуальны, а я зраблю ўсё магчымае, каб падтрымаць навучэнцаў, і, мабыць, нехта з іх сапраўды стане пракурорам.

Аляксандра Фрол расказала, што, калі ім паведамілі, што гімназісты цяпер будуць навучэнцамі прафільнага класа «Юны пракурор», узрадавалася, бо яны будуць знаёміцца з асновамі права і іншымі юрыдычнымі дысцыплінамі. Паколькі навучэнка хоча звязаць сваё жыццё з гэтай сферай, атрыманыя веды, безумоўна, дапамогуць у будучыні. Да таго ж як дзяўчына яна проста не можа не адзначыць, наколькі прыгожа і статутсна яна і яе сябры выглядаюць у сваёй новай форме.

А вось камандзір класа Ілля Кандрашоў канстатаваў, што цяпер ён не толькі адчувае радасць, але і разумее, што на ім ляжыць двайная адказнасць. Калі раней хлопец быў у адказе за свой клас, то цяпер усе яны павінны быць прыкладам для гімназіі.

— З моманту абвяшчэння пра тое, што мы зараз профільны клас, з намі адразу ж пачалі актыўна працаваць; праводзіліся розныя гутаркі, у тым ліку прафарыентацыйныя, вялася падрыхтоўка нашай формы, адбылося некалькі выязных мерапрыемстваў. Асабліва мне ў душу запала паездка на месца пахавання часоў Вялікай Айчыннай вайны ва Уручы. Назад мы ўсе ехалі ў роздумах... Але менавіта гэта мерапрыемства дапамагло мне па-сапраўднаму ўсвядоміць, якая важная роля ўскладаецца на наш клас. Ну і, вядома ж, у будучыні, я спадзяюся, вучоба ў класе «Юны пракурор» дапаможа мне і я ажыццяўлю сваю мару, стаўшы адвакатам.

Анжаліна НОВІКАВА.
Фота дадзены гімназіяй.

ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У выніку атрымалася так, што першае месца працы для нашай гераіні знайшоў яе муж.

— Ён быў сацыяльным педагогам. Мы вучыліся з Уладзімірам на адным факультэце і яго размеркаванем заняліся загадзя: знайшлі школу з неабходнай вакансіяй, — дзеліцца дзяўчына. — Там у яго спыталі, хто жонка па спецыяльнасці. Аказалася, што лагапеды ім былі таксама патрэбны.

Лізавета прызнаецца, што не хацела працаваць у школе. Аднак выбару на той момант не было. Пасля таго як дзяўчына аддала два гады школе, яна адчувала вельмі моцнае прафесійнае выгаранне.

— Дамовілася з мужам, што год не буду працаваць увогуле. Гэта была не лянота. Я адчувала, што ў мяне зусім ні на што няма сіл, — прызнаецца Лізавета.

Аднак ужо праз паўтара месяца дзяўчыне трапіла на вочы вакансія яе мары: лагапед-дэфектолаг у дзіцячым садку, ды яшчэ і побач з домам!

Зразумела, адразу было крыху хвалююча, бо гераіня не мела належнага досведу працы ў такой установе адукацыі, ды яшчэ і ў лагапедычнай групе. Аднак у калектыве да маладога спецыяліста ўсе ставіліся з разуменнем, павагай, і так, крок за крокам, суразмоўніца «ўлілася» ў работу.

— Знаёмілася паступова і старалася не паказваць дзецям сваю мяккасць. Часта яны ўспрымаюць гэта як слабасць, — дзеліцца Лізавета. — З часам устанавіла пэўныя правілы: гэта мая тэрыторыя і мае законы. Верагодна таму цяпер у мяне няма праблем з дысцыплінай.

Дзяўчына працуе ў лагапедычнай групе. Гэта азначае, што спецыяліст увесь час займаецца з аднымі і тымі ж дзецьмі. Нават яе кабінет знаходзіцца ў тым жа памяшканні, што і група.

— Калі ты працуеш «на пункце», то ў цябе розназроставыя дзеці з розных груп. Ты іх бярэш на заняткі, а потым адводзіш назад, — тлумачыць Лізавета. — Я ж займаюся пастаянна толькі са «сваімі» дзецьмі з лагапедычнай групы.

Па словах дзяўчыны, у такім фармаце работы ёсць шмат сваіх плюсаў. Напрыклад, яна можа назіраць, як дзеці вымаўляюць тыя ці іншыя гукі па-за заняткамі, напрыклад падчас гульні з сябрамі. Бывалі ў яе практыцы і выпадкі, калі дзіця абсалютна не жадала ісці на кантакт. Аднак і гэта пытанне дапамагла вырашыць менавіта спецыфіка работы непасрэдна ў групе.

«Адзін хлопчык «закрываўся» падчас заняткаў, як быццам бы гуляў «у маўчанку», — расказвае дзяўчына. Тым не менш Лізавета не здавалася, назірала за гэтым дзіцем і праз нейкі час заўважыла, што хлопчык добра ўзаемадзейнічае са сваім прыяцелем у групе.

— Я прапанавала прыйсці разам з сябрам. І ён пагадзіўся, — гаворыць дзяўчына. — Пачаў наведваць мае заняткі. Спачатку ў кампаніі, а потым і самастойна.

Лізавета ўжо больш за год працуе ў дзіцячым садку. Група, якая выпусціцца сёлета, будзе яе першым «лагапедычным» вопытам. Ужо цяпер дзяўчына бачыць станоўчыя вынікі сваёй працы і ніякага выгарання не адчувае: толькі аддачу ад дзяцей і падзяку ад бацькоў.

— Я рада, што выбрала гэту прафесію. Хочацца развівацца толькі тут, — упэўнена кажа наша гераіня.

Самае цікавае, што калі зайшла размова пра мінусы ў рабоце, дзяўчына нават не знайшлася, што адказаць.

— Калі я змяніла кірунак на той, што хацела першапачаткова, усе недахопы быццам бы зніклі, — гаворыць Лізавета і тут жа з усмешкай дадае: — Хіба што рэдкія сітуацыі, калі падмяняеш выхавацеля і даводзіцца ў холад гуляць на вуліцы — гэта, мусіць, адзіны мінус.

Аднак для таго каб праца так лягла да душы, трэба ўсё ж валодаць некаторымі якасцямі. Сярод іх наша гераіня ў першую чаргу назвала любоў да дзяцей: «Гэта аснова. Не можа ісці гаворкі ні пра якую камфортную і плённую працу, калі ў вас гэта не закладзена».

Натуральна, нікуды без стрэсаўстойлівасці, камунікабельнасці і цярпення, як і ў любой іншай працы. Але, па словах гераіні, усё гэта прыйдзе, калі сама сфера дзейнасці вам будзе даспадобы. Вядома, будуць і ўзлёты, і падзенні, але калі вы бачыце сябе побач з дзецьмі, калі гатовы дзяліцца з імі сваёй энергіяй і атрымліваць шчырую аддачу ўзамен, то гэта дакладна тая спецыяльнасць, якая вам падыходзіць.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

ШАНС ПАТРАПІЦЬ У ІНШУЮ ЭПОХУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Як расказала дзяўчына, ёсць клубы, якія спецыялізуюцца на Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме, Сярэднявеччы, на Другой сусветнай вайне. Любы гістарычны перыяд, які табе цікавы, можна рэканструяваць.

Падчас баталій выкарыстоўваецца муляжная зброя. Яна выглядзіць майстрамі з улікам асаблівасцяў той эпохі.

Цяпер Ганна займаецца эпохай пачатку XIX стагоддзя. Яна прызнаецца: гісторыя і літаратура таго часу выклікае ў яе вялікую цікавасць. Суразмоўніца таксама адзначыла, што па ваеннай рэканструкцыі гэты перыяд у Беларусі адзін з найбольш развітых.

Пры рэканструкцыях Ганна выконвае ролю маркітанткі, працуе з правіянтам.

— У французскай арміі ў маркітантак было шмат абавязкаў: яны адказвалі за падрыхтоўку і забеспячэнне неабходнымі таварамі, маглі аказваць першую медыцынскую дапамогу, падчас баталій часткова выконваць работу санітарак, сачылі за абозам, займаліся рамонтам адзення, пры неабходнасці нават удзельнічалі ў ваенных дзеяннях.

Акрамя ваеннай рэканструкцыі дзяўчына таксама займаецца і свецкай. Па словах суразмоўніцы, над узнаўленнем мінулага працуюць людзі розных узростаў і прафесій, ніякіх абмежаванняў няма. Члены клуба могуць прайграць гістарычныя падзеі альбо на закрытых мерапрыемствах, для сябе, альбо арганізуюць паказальныя выступленні. Пры рэканструкцыі яны абапіраюцца на кнігі пра тую эпоху, архіўныя матэрыялы, у тым ліку, на замежныя. У клубе састаяць людзі, якія з цікавасцю займаюцца сваёй справай. Па словах Ганны, некаторыя ўдзельнікі маюць гістарычную адукацыю, а іх кіраўніком з'яўляецца аспірант гістарычнага факультэта.

Члены клуба праводзяць балі, арганізуюць пікнікі, танцуюць і весела бавяць час — гэта праходзіць пад адпаведную музыку і ў гістарычных касцюмах, якія вырабляюцца самастойна або заказваюцца ў атэлье. Для сваіх выступленняў Ганна шые касцюмы сама.

— У атэлье пашыў сукенкі «нашай» эпохі будзе каштаваць каля 200 рублёў. Гэта атрымаецца просты ўбор, без празмернасцяў. Калі жадаеш дадаць ручную вышыўку, кошт павялічыцца. Сёння ў маёй калекцыі ёсць бальныя ўборы, прагулачныя сукенкі для пікнікоў і вобразы для ролі маркітанткі.

Лакацый для правядзення рэканструкцый шмат. Балі, напрыклад, праходзяць у розных месцах — ад палацаў да асабнякоў. Яны арганізоўваюцца ў Мірскім і Нясвіжскім замках, у сядзібе І. Х. Каладзеева, у Доме Ваньковічаў, нейкі час праводзіліся і ў «Лошыцкай сядзібе». Ваенныя рэканструкцыі адбываюцца на месцах бітваў або ў мясцовасці з полем, лесам і ракой паблізу.

Пры ваенных рэканструкцыях удзельнікі арганізуюць гульнявыя баталіі.

— Пытанне аб тым, як будуць праходзіць баталіі — па сцэнары або па пэўных правілах, — вырашаецца калегіяльна. Камандзіры клубаў, якія плануюць прыняць удзел, папярэдне збіраюцца і абмяркоўваюць правілы. Напрыклад, пры дэманстрацыі стрэлаў мы выкарыстоўваем петарды, якія даюць шмат шуму. І калі ў баталіі ўдзельнічаюць вершнікі, то такі гучны гук можа спалохаць коней. Таму ёсць правіла наконт таго, што нельга шумець і страляць побач з кавалерыяй.

Падчас баталій выкарыстоўваецца муляжная зброя. Яна выглядзіць майстрамі з улікам асаблівасцей той эпохі. Ганна адзначыла, што можа быць нават нешта з археалагічных раскопак, але такое бывае рэдка. На фестывалях удзельнікі знаходзяць вольны ад выступленняў час, каб пакантактаваць з гледачамі: яны фатаграфуюцца, дзеляцца фактамі з гісторыі, расказваюць пра элементы абмундзіравання.

Пры выездзе на вайсковыя мерапрыемствы клуб разбівае лагер. Спецыяльныя палаткі ўстанаўліваюцца, як у часы той эпохі. Па словах Ганны, удзельнікі імкнуцца выключаць на тэрыторыі лагера ўсе сучасныя прадметы.

«Сёння ў маёй калекцыі ёсць бальныя ўборы, прагулачныя сукенкі для пікнікоў і вобразы для ролі маркітанткі».

Пакупную ежу яны кудысьці прыбіраюць, каб тая не была бачная на фатаграфіях, або перакладаюць усё ў драўляны посуд, гліняныя збаны, заварочваюць у тонкую паперу або кладуць у палатняныя мяшкі.

— Посуд мы выкарыстоўваем гліняны, драўляны ці металічны — той, які быў ці мог быць у гэтую эпоху. Дапускаецца і алюмініевы посуд, хоць гэты метал у той час не быў шырока распаўсюджаны. З простых прадуктаў імкнемся гатаваць стравы, якія падаваліся ў пэўны гістарычны перыяд. Інфармацыю аб іх можна атрымаць з даведнікаў.

Па словах Ганны, патрапіць у клуб можна ў любы момант. Для гэтага неабходна звязацца з кімсьці з яго членаў і паведаміць, што ты таксама жадаеш стаць удзельнікам.

— Мусіць, адзінае патрабаванне — гатоўнасць наведваць мерапрыемствы, актыўна ўдзельнічаць у рэканструкцыях.

Суразмоўніца адзначыла, што каштоўнасць іх дзейнасці ў першую чаргу заключаецца ў асвеце, вывучэнні падзей мінулага.

— На мой погляд, гісторыя — адна з самых важных і неабходных навук для кожнага чалавека незалежна ад яго прафесіі. Я лічу, рэканструкцыя настолькі шматгранная сфера дзейнасці, што любы, нават не асабліва зацікаўлены гісторыяй, можа знайсці ў ёй нешта цікавае для сябе. Гэта хобі дае мне магчымасць мець стасункі з людзьмі, якія разбіраюцца ў гісторыі, весела праводзіць час, дазваляе адпачыць і расслабіцца.

Лізавета МАЛЬЧУК.
Фота дадзены гераіняй.

Свой стыль

АД СУМНЫХ ДУМАК — ТАНЦЫ НА ПІЛОНЕ

У выпускніцы БДУ Юліі РАМАНЬКОВАЙ захапленняў шмат: ад спеваў і ігры на гітары да фатаграфіі. А пэўны час таму дзяўчына адкрыла для сябе яшчэ адзін новы занятак — танцы на пілоне (шасце). Мы пагаварылі аб яе незвычайным хобі.

Суразмоўніца прызнаецца: усё пачалося цікавым чынам.

— Мы з мамай любім па вечарах глядзець розныя рэаліці-шоу. Неяк у адным з выпускаў такой праграмы ўдзельнічала дзяўчына, якая займалася танцамі на пілоне. Я жартам сказала маме, што таксама хачу так танцаваць. Яна адказала: «Чаму б і не?» Яе рэакцыя мяне вельмі здзівіла, і я задумалася: магчыма, сапраўды трэба паспрабаваць? Раптам спадабаецца? Ужо на наступны дзень занялася пошукам студый, стала даведвацца пра кошт і ў выніку запісалася на занятак.

Яшчэ адна прычына, па якой Юлія вырашыла паспрабаваць сябе ў танцах на пілоне, — жаданне на нешта пераключыцца. У той перыяд дзяўчына страціла работу, была вельмі засмучаная і не ведала, у якім кірунку ёй далей рухацца. Мама прапанавала Юліі паспрабаваць нешта новае, каб вызваліцца ад сумных думак.

Бацькі станоўча паставіліся да новага захаплення дачкі. Тата Юліі глядзіць ролікі, якія дзяўчына здымае падчас заняткаў, маці, у сваю чаргу, з гонарам паказвае відэа сябрам і калегам. Юлія размяшчае запісы з заняткаў у Instagram, многія сваякі глядзяць іх, хваляць дзяўчыну і здзіўляюцца яе здольнасцям. Сябры дзяўчыны таксама падтрымліваюць яе ў новым хобі.

— Я лічу, што гэта вельмі прыгожа. Калі пачала займацца, па-сапраўднаму захапілася гэтым відам танцаў. Пераканалася, што ён найбольш мне падыходзіць, бо ў ім харэаграфія спалучана з акрабатыкай і спартыўнай гімнастыкай.

— Калі прыйшла на першы занятак і ўбачыла пілон, наогул не ведала, што ён можа сам круціцца. Мне здавалася, што дзяўчаты, якія танцуюць на ім, выконваюць усё самастойна.

З пятага класа Юлія займалася ў спартыўнай школе, да гэтага два гады прысвяціла прафесійнаму плаванню, але нават такая фізічная падрыхтоўка не дала дзяўчыне магчымасці доўга пратрымацца на пілоне. Для гэтага патрэбны вельмі моцныя рукі.

Цяпер Юлія ўмее працаваць з пілонам, разумее, што ён з сябе ўяўляе. Дзяўчына здольная выконваць невялікія звязкі — танцы, якія складаюцца з некалькіх элементаў. Адна з асаблівасцяў работы на пілоне — сінякі на целе, мазалі на руках. Па словах суразмоўніцы, з цягам часу скура і мышцы прывыкаюць, становіцца прасцей:

— Ёсць цяжкасці з выкананнем некаторых заданняў. З-за плавання ў мяне накачанае цела, але няма гнуткасці. Праз гэта нейкія элементы ў танцы мне пакуль недаступныя, некаторыя я прапрацоўваю працяглы час.

Нягледзячы на цяжкасці, Юлія з нецярпеннем чакае дня, калі трэба ісці на трэніроўку. Дзяўчына займаецца ў вячэрні час — гэта зручна, бо хобі не перашкаджае іншым справам.

— Танцы на пілоне станоўча паўплывалі на маё маральнае і фізічнае самаадчуванне, — кажа яна. — Я адкрыла для сябе нешта абсалютна новае і незнаёмае. Калі перастала прафесійна займацца плаваннем, фізічная падрыхтоўка крыху пагоршылася, хоць я і хадзіла ў басейн. Пасля двух месяцаў заняткаў на пілоне змагла вярнуць ранейшы фізічны стан, умацавала спіну, пазбавілася ад болю ў паясніцы. Я даведалася, што для пілона ёсць дзве катэгорыі спаборніцтваў: профі і аматары. У другой катэгорыі спаборнічаюць людзі з вопытам адзін-два гады — чаму б не паспрабаваць? Мне хацелася б рэалізаваць сябе на якіх-небудзь спаборніцтвах па гэтым відзе спорту.

Лізавета МАЛЬЧУК.
Фота дадзена гераіняй.

[стракаты свет]

ПРАБЛЕМА З «БЕСПІЛОТНЫМІ» КАДРАМІ БУДЗЕ ЗАКРЫТА

Міністэрства адукацыі і навукі РФ у 2025 годзе плануе навучаць 40 тысяч студэнтаў у сферы беспілотных сістэм. Аб гэтым піша РІА «Новости» са спасылкай на прэс-службу ведамства.

«Плануецца, што ва ўніверсітэтах у 2025 годзе профільнае навучанне, звязанае са сферай беспілотных авіяцыйных сістэм, будуць праходзіць каля 40 тысяч студэнтаў», — сказана ў заяве. У міністэрстве дадалі, што ў 2030 годзе вучыцца ў гэтай сферы будуць ужо каля 180 тысяч студэнтаў. У прэс-службе Міністэрства адукацыі і навукі Расіі таксама заявілі, што праблема з кадрамі ў галіне беспілотных авіяцыйных сістэм будзе поўнасцю закрыта дзякуючы падрыхтоўцы спецыялістаў для гэтай галіны ў ВНУ.

СТУДЭНТЫ-ЭКОЛАГІ АТРЫМЛІВАЮЦЬ НОВУЮ СТЫПЕНДЫЮ

Ва Узбекістане з верасня таленавітыя студэнты-экалагі атрымліваюць стыпендыю міністра экалогіі, паведамляе Мінюст.

Яна прадугледжана пастановай прэзідэнта «Аб мерах па арганізацыі дзейнасці Цэнтральна-Азіяцкага ўніверсітэта вывучэння навакольнага асяроддзя і змены клімату».

Студэнтам, якія навучаюцца на платна-кантрактнай аснове, стыпендыя прызначаецца за кошт сродкаў Экалагічнага фонду для пакрыцця сумы платнага кантракта за адзін навучальны год. Стыпендыя выплачваецца штомесяц у трохразовым памеры базавай разліковай велічыні. Студэнтам на дзяржаўным гранце (бюджэце) будуць прызначаць стыпендыі ў шасціразовым памеры базавай разліковай велічыні.

Стыпендыя прызначана для студэнтаў, якія навучаюцца па кірунках «экалогія», «ахова навакольнага асяроддзя», «лясная гаспадарка», «зялёная» эканоміка», «гідраметэаралогія» і іншых.

НАКОЛЬКІ ДЫПЛОМ АБ «ВЫШЦЫ» ДАПАМАГАЕ Ў КАР'ЕРЫ

Згодна з вынікамі апытання сэрвісу «Работа.ру», якія прыводзіць ТАСС, большасць (67 працэнтаў) расіян, якія маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі, лічаць, што ён дапамог ім пабудаваць кар'еру.

34 працэнты апытаных лічаць, што вышэйшая адукацыя вельмі важная для паспяховай кар'еры. Траціна ўдзельнікаў апытання адзначылі важнасць вучобы ў ВНУ на тры балы з пяці, а 22 працэнты — на чатыры з пяці. Таксама 10 працэнтаў рэспандэнтаў указалі, што дыплом зусім не важны для працы (адзін бал), а 6 працэнтаў паставілі два балы з пяці.

Крыху больш за палову (56 працэнтаў) з тых, хто адзначае карысць вышэйшай адукацыі, упэўнены, што дыплом дае перавагі пры працаўладкаванні. 47 працэнтаў у плюсах вышэйшай адукацыі ўказалі, што яна дае навык вучыцца і шукаць інфармацыю, 46 працэнтаў — веды і ўменні па прафесіі, 37 працэнтаў — развівае навык работы з вялікім аб'ёмам інфармацыі, 26 працэнтаў — вучыць ставіць мэты і дасягаць іх, 25 працэнтаў — развівае навык дамаўляцца і камунікаваць з людзьмі.

Сярод тых, хто лічыць, што адукацыя не важная для кар'еры, 65 працэнтаў упэўненыя, што практычныя навыкі можна атрымаць толькі на рабоце. Крыху больш за палову (58 працэнтаў) упэўненыя, што ўніверсітэцкія веды ніяк не звязаныя з рэальным жыццём.

Пры гэтым на нізкую якасць вышэйшай адукацыі ўказалі 33 працэнты рэспандэнтаў, столькі ж яшчэ думаюць, што працадаўцы не глядзяць на наяўнасць дыплома. Яшчэ чвэрць апытаных сказалі, што праграмы ВНУ шмат у чым састарэлі.

ШЧАСЛІВАЕ ДЗЯЦІНСТВА ЗАЎСЁДЫ АДНОЛЬКАВАЕ ВА ЎСІХ

Амерыканка Кэры Маўзэс з Лос-Анджэлеса вырашыла падзяліцца сваёй знаходкай з сямейнай хронікі. Бабуля і дзядулі Кэры аддалі ёй старыя кінастужкі, знятыя на камеру, калі мама дзяўчыны была маленькай.

Кэры іх алічбавала і затым параўнала з відэа з яе дзяцінства. Аказалася, што дзяўчынкі ў 2000-х і ў 1960-х пражываюць вельмі падобныя жыцці, радуюцца адным і тым жа рэчам і гуляюць амаль у адны і тыя ж гульні. Пра гэта паведамляе Scary Mommy.

Свае відэакалажы Кэры выклала ў сваім TikTok. На відэа яна скампанавала практычна ідэнтычныя моманты са свайго дзяцінства і дзяцінства сваёй мамы. Вось абедзве дзяўчынкі крыўляюцца на камеру, вось скачуць, вось водзяць карагоды з іншымі дзецьмі, а вось — пырскаюцца ў надзіманым басейне ў дварэ.

Першы TikTok з сумеснай кінахронікай з дзяцінства маці і дачкі набраў 1,2 мільёна праглядаў. Тады Кэры вырашыла зрабіць другое відэа, пра якое яе вельмі прасілі ў каментарыях. Другі ролік пачынаецца з выявы маленькай мамы Кэры, якая трымае ляльку, і заканчваецца кароткім кліпам, у якім ляльку з рук мамы ў 1998 годзе атрымлівае ўжо сама Кэры.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«Часам я магу паводзіць сябе як абсалютная авантурыстка»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Раскажыце, на якой музыцы вы раслі?

— На самай рознай. Напрыклад, у маёй сястры былі кружэлкі Грыга, гуртоў «Браты Грым», «Мумі-Троль». Бацька любіў Pink Floyd, Deep Purple. Мама любіць Queen, а можа паслухаць і нешта з папулярнай музыкі. І плюс кожны дзень я слухала тое, што чатырыпяць гадзін мая сястра іграла на фартэпіяна.

— Калі самі ствараеце музыку, то чым натхняецеся?

— Я не гляджу на сучасных маладых выканаўцаў, не слухаю іх, бо такая музыка ўвогуле мне не блізкая. Мне хутчэй даспадобы кампазіцыі Мікалая Наскова, некаторыя песні Рыгора Лепса. А калі глядзець па аранжыроўцы, то мне блізкая музыка Максіма Фадзеева, Меладзэ, падабаюцца творы Адэль. Словам, я прыхільніца класічнай эстрады. А сучасныя песні на трох акордах, дзе няма музычнага развіцця і толькі гучыць клубны біт, на мяне не аказваюць уздзеяння. У мяне ёсць музычная адукацыя, і я разумею, як кампазіцыя павінна выглядаць, таму маладзейшым выканаўцам здзівіць мяне складана. У мяне самой пры напісанні музыкі ёсць жаданне гаварыць пра глыбокія філасофскія тэмы, але ў выніку атрымліваюцца тэксты пра каханне, прычым абявязкова з ноткай драматызму.

— Як вы пражывалі нешчаслівае каханне і што цэніце ў адносінах?

— Усё заўсёды па-рознаму адбываецца. Калі пара разыходзіцца, то перажыванні ўжо ідуць на спад. А пакуль яшчэ толькі пражываеш моманты, дзе штосьці не складваецца, не можаш зразумець, сысці ці застацца і спрабаваць выправіць становішча — вось гэта цяжка. Пасля рашэння сысці і паставіць кропку, як правіла, эмоцыі адпускаюць.

Ва ўзаемаадносінах двум людзям вельмі важна сысціся, нібы пазлам. Трэба каб не было прабелаў па жыццёва важных момантах што датычыцца побыту, развіцця і іншага, каб не існавала недасказанасці. Самае важнае, на мой погляд, — уменне размаўляць з чалавекам, які побач, мець магчымасць патлумачыць сваю пазіцыю па нейкім пытанні, агучыць уласную занепакоенасць і атрымаць зваротную сувязь. Калі разумееш, што цябе прымаюць і разумеюць. І вы разам супраць нейкай праблемы, а не вырашаеце яе, змагаючыся адно з адным.

— Яшчэ вы неяк казалі, што любіце кнігі. Чым цікавіцеся ў літаратуры?

— Чытаю я ўвесь час. Калі, напрыклад, стомленая і ёсць вольная хвіліна, то з задавальненнем выберу адпачынак з кнігай. Мне падабаецца чытаць, адкрываючы для сябе

Бліц-апытанне:

• Спяваць для душы ці для заробку? — Хочацца для заробку, але атрымліваецца для душы.

• Дзеля чаго і каму вы гатовыя даць другі шанс? — Усе памыляюцца і заслугоўваюць гэты другі шанс.

• Ці верыце вы ў прыкметы? — Не.

• Калі даведаліся, што Дзеда Мароза не існуе? — Я да сёння яшчэ крыху веру ў яго існаванне.

• Лепшае свята для вас — гэта... — Новы год!

штосьці новае. Таксама люблю пісаць рэцэнзіі на прачытаныя творы. Вяду нават адпаведную старонку ў сацыяльных сетках, дзе дзялюся тымі выданнямі, на якія варта звярнуць увагу. Бо ў той жа тэме псіхалогіі лепш пачытаць адпаведны падручнік савецкіх часоў, чым шматлікія папулярныя кнігі, што ёсць сёння на кніжных паліцах.

— Якое ў цэлым у вас стаўленне да сацыяльных сетак?

— Думаю, што ўсе людзі ў пэўнай меры нарцысы і ствараюць сабе там старонкі для нейкага самаўзвышэння. Мне таксама падабаецца весці сацыяльныя сеткі, прычым з задавальненнем раблю як карысныя, так і лёгкія, эстэтычна прыгожыя для мяне пасты. Там я захоўваю на памяць прыемныя моманты са свайго жыцця. Увогуле для мяне сацыяльныя сеткі маюць добрую функцыю «запамінаць важнае праз штодзённыя гісторыі», бо мы ўсе цяпер жывём, спяшаючыся, і многае забываем. Таксама нельга не сказаць пра тое, што там можна знайсці добрую пляцоўку для прасоўвання нейкага прадукту і атрымання грошай. Але мне не хочацца ператвараць свае профілі ў нешта падобнае.

— А што вамі рухала, калі паставілі сабе мэту атрымаць працу ў аркестры імя М. Фінберга?

— Паколькі даўно чула, што працаваць у гэтым калектыве салідна, то хацелася трапіць туды. Спрабавала ўвесь час недзе сустрэцца з аркестрам, каб паказаць сябе. А вось калі пачала працаваць там, то зразумела, што гэта не мой фармат. Мне ёсць з чым параўноўваць, бо я тры гады працавала з аркестрам імя Васілеўскага ў Гомельскай абласной філармоніі, куды пасля і вярнулася.

— Прыгадаеце свае самыя шчаслівыя ўспаміны з дзяцінства?

— Гэта Новы год, калі я загадала Дзеду Марозу падарыць мне ананас. І мама з татам купілі мне ад імя чараўніка гэтую смакату.

— Як ставіцеся да навагодніх свят?

— Я вельмі не люблю холад, але паколькі часцей за ўсё ездж на машыне, то мне падабаецца назіраць за тым, як ідзе снег, як навокал усё прыгожа і казачна. Са з'яўленнем першага снегу адразу пачынаю ўпрыгожваць дом, каб ва ўсім адчувалася навагодняя атмасфера. З узростам мяняецца ўспрыманне гэтага чароўнага часу. Калі раней мне хацелася весяліцца з сябрамі, кудысьці выбірацца, то цяпер лепшае свята — магчымасць пабыць дома з бацькамі.

— У студзені вы святкуеце дзень нараджэння. Ці ўласціва вам падводзіць напярэдадні нейкія вынікі і ставіць мэты на будучы год?

— Я люблю перыядычна распісваць сабе планы на месяц, паўгода, а пасля іх толькі абнаўляю. Таму напярэдадні дня нараджэння толькі звяраюся з напісаным, каб пераканацца, што іду па зададзеным курсе.

— Што сёння для вас у прыярытэце: далей рэалізоўвацца ў творчасці альбо думаць ужо пра стварэнне сям'і?

— Апошні год я не раздзяляю для сябе гэтыя дзве тэмы. Па-першае, у мяне заўсёды так складваецца, што ўсе важныя рашэнні прымаюцца пад уплывам кахання. Гэтае пачуццё вырашае ўсё за мяне, і яно ж дае мне імпульсы для развіцця і росту. Нядаўна я пачала задумвацца пра тое, у якім узросце хацела б стаць мамай, таму планую ў перспектыве рэалізоўвацца ў працы, і каб паралельна ў мяне з'явілася сям'я і дзеці. Зараз імкнуся ствараць тыя ўмовы, якія дазволяць гарманічна ўсё сумяшчаць.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва гераіні.
Цалкам інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 11.292.
Нумар падпісаны ў 19.30 10.01.2024 г.

БЕЗ СПАДЗЯВАННЯЎ НА ЛЕПШАЕ

Што адбываецца ў Літве?

Больш за палову жыхароў Літвы лічаць, што 2024 год будзе складаным у фінансавым плане з-за росту цэнаў і інфляцыі. Гэта вынікае з апытання кампаніі па даследаванні грамадскай думкі Spinter tyrimai, якое праведзена па замове банка Medicinos Bankas. Адзначаецца, што адпаведнай пазіцыі прытрымліваюцца 52 працэнты рэспандэнтаў. Так, найчасцей пра гэта думаюць жыхары раённых цэнтраў і сельскай мясцовасці, а таксама фермеры і сем'і з нізкім узроўнем даходу. Дырэктар бізнес-службы Medicinos bankas Юлюс Івашка адзначыў, што песімістычныя настроі насельніцтва наконт надышоўшага года могуць быць абумоўлены не толькі прагнозамі эканамістаў, але і тым, што ўладам не ўдалося пазбегнуць скачка інфляцыі і павышэння цэнаў на розныя тавары. Даведзеныя да адчаю людзі проста не чакаюць пазітыўнай перспектывы. Што ж адбываецца ў Літве?

БЕСКАРЫСНЫ «АПЕНДЫКС»

Эканоміка Літвы перажывае ўсёабдымны заняпад: скарачаюцца аб'ёмы транзіту, прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, насельніцтва зацягвае паясы, затое вялізныя сумы трацяцца на ўзброеныя сілы. Такая аказалася плата за неадпаведныя геапалітычныя амбіцыі — Літва ператвараецца ў бескарысны «апендыкс» ЕС і НАТА, адзначае iz.ru.

Жыхары Літвы вымушаны эканоміць і скарачаць спажыванне. Многія мясцовыя кампаніі звальняюць супрацоўнікаў, прыпыняюць работу і фіксуюць спад вытворчасці. Валавы ўнутраны прадукт краіны за тры кварталы мінулага года склаў 53,4 мільярды ў сапраўдных цэнах. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года змяненне рэальнага ВУП аказалася адмоўным і склала мінус 0,5 працэнта. У літоўскім Дзяржаўным агенцтве даных тлумачаць гэты спад дрэннымі вынікамі дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў і фірмаў аптовага і рознічнага гандлю, а таксама кампаній, звязаных з аперацыямі з нерухомасцю. Агульны аб'ём прамысловай вытворчасці ў Літве са студзеня па кастрычнік знізіўся ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 5,5 працэнта і склаў €29,3 мільярда. Скарачэнні назіраюцца ў шэрагу стратэгічных сектараў, сярод якіх — вытворчасць рафінаваных нафтапрадуктаў, металаў, камп'ютарнай, электроннай і аптычнай прадукцыі, электрычнага абсталявання, тэкстыльных вырабаў, хімікатаў і хімічнай прадукцыі.

Паказальным у гэтым плане стаў лёс вялізнага літоўскага завода фосфарных і азотных угнаенняў Lifosa, які даваў работу амаль тысячы жыхароў краіны. Яго дзейнасць была абмежавана з-за санкцый Еўрасаюза, накладзеных на Андрэя Мельнічэнку — члена савета дырэктараў кампаніі «Еўрахім», якой належыць гэтае прадпрыемства. Узніклі цяжкасці з пастаўкамі аміяку, і завод спыніўся. У ліпені мінулага года рабочыя завода правялі мітынг у Вільні — яны выйшлі з плакатамі «Мы кормім зямлю, зямля корміць сем'і», «900 сем'яў без даходаў», «Мы хочам тут працаваць, мы не жадаем з'яджджаць». Уладальнікі прадпрыемства адчайна спрабавалі аднавіць вытворчасць, але, у рэшце рэшт, пастанавілі кансерваваць завод «да лепшых часоў».

ПРЫБЫТАК СКАРАЦІЎСЯ Ў 20 РАЗОЎ

Транспартны сектар балтыйскай рэспублікі таксама перажывае крызіс — зноў жа з-за палітычнага канфлікту Літвы з Беларуссю, працяглых антырасійскіх санкцый і закрыцця ўсходніх рынкаў. У мінулым годзе грузаперавозкі Літоўскіх чыгунак упалі амаль на 40 працэнтаў, а чысты прыбытак скарацiўся ў 20 разоў. А ўжо ў снежні 2023-га паступілі даныя аб тым, што летась за 11 месяцаў праз порт у Клайпедзе (галоўныя марскія вароты Літвы) перавалена 30,1 мільёна тон грузаў, што на 10 працэнтаў менш, чым за аналагічны перыяд 2022-га, калі было адгружана 33,3 мільёна тон. Так, са студзеня да лістапада праз Клайпеду перавалена 7,1 мільёна тон наліўных грузаў, што на 3 працэнты менш, чым за той жа перыяд 2022-га. Найбольшы ўплыў на паказчыкі ў гэтай групе перавозак аказала падзенне пагрузкі нафтапрадуктаў і вадкіх угнаенняў.

У сваю чаргу, перавозка навалачных грузаў (сельскагаспадарчая прадукцыя, карысныя выкапні, будаўнічыя матэрыялы і г. д.) у студзені—лістападзе 2023 года знізілася ў параўнанні з гэтым жа перыядам 2022-га на 10 працэнтаў — да 8,5 мільёна тон. Найбольшы спад прыкметны ў сегменце сыпкіх угнаенняў. Перавалка генеральных грузаў (кантэйнеры, драўніна, вырабы з жалеза і сталі, металаканструкцыі, замарожаныя грузы) летась за 11 месяцаў знізілася ў параўнанні з мінулым годам на 13 працэнтаў — да 14,6 мільёна тон. У гэтым сегменце найбольшы ўплыў аказала падзенне пагрузкі вырабаў з жалеза і сталі, металаканструкцый. Са студзеня па лістапад у порце было перавалена 867,7 тыс. тон грузаў у кантэйнерах (TEU), што таксама менш, чым у мінулым годзе.

Падкрэсліваецца, што захоўваецца тэндэнцыя росту колькасці пустых кантэйнераў, якія перавозяцца суднамі, і зніжэння колькасці поўных. У мінулым годзе ў Клайпеду са студзеня па лістапад зайшлі 4,9 тысячы караблёў, што менш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 4 працэнта.

На паказчыкі работы Клайпедскага порта адчувальна паўплывала страта грузаў найбуйнейшага ў Прыбалтыцы вытворцы азотных угнаенняў Achema і прадпрыемства Lifosa, якім прыйшлося прыпыніць дзейнасць з-за рэзкага росту цэн на энергію і сыравіну. Прэзідэнт літоўскай Асацыяцыі марскіх грузавых кампаній Вайдотас Шылейка кажа, што грузаперавозкі ў Клайпедзе ў 2023 годзе дасягнулі «дна». Ён раней выказаў надзею, што порт у мінулым годзе зможа пераваліць хаця б 33,1 мільёна тон грузу. Спадзяванні эксперта аказаліся марнымі. Іншыя прадпрымальнікі выказваюцца больш жорстка. Галоўны акцыянер клайпедскай кампаніі «Тэрмінал насыпных грузаў» Ігар Удавіцкі ў роспачы падкрэслівае, што разрыў Літвой дагавора аб чыгуначным транзіце ўгнаенняў з Беларусі праз Клайпеду з'яўляецца парушэннем міжнароднага права, а таксама законаў краіны Прыбалтыкі. «Літва не мела законнага права забараняць транзіт «Беларускалію», скасоўваць дамову транспарціроўкі, якая з'яўляецца самастойным аб'ектам інвестыцый, спыняць доступ да тэрмінала», — заявіў Удавіцкі. Ён нагадаў, што ў выніку аднабаковага скасавання дагавораў прыбалтыйская рэспубліка страціла сотні мільёнаў еўра і тысячы працоўных месцаў з-за перакрыцця транзіту калійных угнаенняў.

У трэцім квартале мінулага года ў Літву і з яе было перавезена чыгуначным транспартам 1,3 мільёна тон грузаў, што амаль на чвэрць (на 23,3 працэнта) менш, чым за аналагічны перыяд 2022-га. Асабліва пацярпеў беларускі вектар літоўскіх грузаперавозак. «У выніку ўведзеных абмежаванняў аб'ёмы грузаў, увезеных і вывезеных з Беларусі чыгуначным транспартам, знізіліся на 56,5 працэнта», — паведаміла Дзяржагенцтва даных. Спрабуючы вырашыць свае фінансавыя праблемы, кампанія LTG Cargo, якая ўваходзіць у групу Літоўскіх чыгунак, аб'явіла, што істотна павышае цэны на свае паслугі па грузаперавозках. Як растлумачылі ў адміністрацыі кампаніі, на такі крок ім прыйшлося пайсці з-за росту затрат, інфляцыі і памяншэння аб'ёмаў прыбытку. Так, грузавыя перавозкі паміж Літвой, Расіяй і Беларуссю сёлета падаражэюць на 46—62 працэнты, кантэйнерныя перавозкі ў краіны ЕС — да 13 працэнтаў, перавозкі па мясцовых маршрутах — на 5—10 працэнтаў.

ВОГНІШЧЫ ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

Незадаволеныя і літоўскія аграрыі. Савет сельскай гаспадаркі Літвы, які аб'ядноўвае большасць фермераў дзяржавы, днямі распачаў маштабныя акцыі пратэсту, у рамках якіх незадаволеныя сяляне распальваюць вогнішчы па ўсёй краіне. Таксама яны ладзяць пратэсны марш па Вільнюсе на трактарах. Мэта акцыі — дабіцца адстаўкі міністра сельскай гаспадаркі Кястуціса Навіцкаса. «Крызіс у сельскай гаспадарцы працягваецца каля трох гадоў, і ўжо была арганізавана не адна акцыя пратэсту фермераў. Мы лічым, што цяпер дасягнуты крытычны пункт, калі перад сельскай гаспадаркай Літвы паўстала экзістэнцыйнае пытанне», — адзначыў кіраўнік савета Ігнас Хофманас.

Сёлета літоўскія фермеры ўжо неаднаразова выказвалі сваё негатыўнае стаўленне да дзейнасці міністэрства сельскай гаспадаркі і патрабавалі адхілення яго цяперашняга кіраўніка. Яго абвінавачваюць, у прыватнасці, у няўменні дапамагчы малочным гаспадаркам, якія сутыкнуліся са значнымі фінансавымі цяжкасцямі з-за падзення закупачных цэн на малако — з 0,47 да 0,27 еўра за літр (пры сабекошце ў 0,35 еўра). «Малочная жывёлагадоўля скарачаецца, існуе велізарны крызіс. Многія фермеры не нарыхтавалі корм на зіму. Каля трох тысяч чалавек увогуле перасталі займацца фермерствам, колькасць кароў скарацілася на 7,6 тысячы. Фермеры недаатрымалі звыш 120 мільёнаў еўра даходаў», — скардзіцца старшыня Літоўскай асацыяцыі малочных фермераў Ёнас Віленіс.

У Літве захоўваецца напружаная сітуацыя таксама і з аплатай працы настаўнікаў і медыкаў, якія рэгулярна страйкуюць і патрабуюць ва ўрада павышэння заробкаў. Раней галоўны эканаміст банка Luminor Жыгімантас Маўрыцас заявіў, што няроўнасць даходаў у Літве па-ранейшаму застаецца адной з самых высокіх у Еўрасаюзе. У прыбалтыйскай краіне расце дарагавізна і назіраецца дэфіцыт.

Даследаванне, праведзенае па замове Swedbank, паказала, што працяглы рост цэнаў і эканамічная нявызначанасць павялічылі колькасць жыхароў Літвы, абмежаваных у выдатках. 66 працэнтаў насельніцтва вымушаныя былі штодня эканоміць. «Эканамічная сітуацыя апошняга перыяду сапраўды ўзмацніла хваляванні насельніцтва наконт фінансаў. Для некаторых з іх яна абярнулася сапраўднымі фінансавымі праблемамі. Цэлых 37 працэнтаў рэспандэнтаў адзначаюць, што іх даходы за апошнія 12 месяцаў значна знізіліся. Два гады таму доля такіх рэзідэнтаў складала 22 працэнты», — заўважыла супрацоўніца Swedbank Юратэ Цвілікене.

Паводле яе слоў, Літва лідзіруе ў Прыбалтыцы па колькасці жыхароў, вымушаных жорстка эканоміць: у Латвіі такіх 47 працэнтаў, а ў Эстоніі — 54 працэнта. «Мы назіраем тыя ж тэндэнцыі, што і ў 2020 годзе, калі пачалася пандэмія. Толькі на гэты раз змена фінансавых паводзін насельніцтва абумоўлена інфляцыяй, ваганнямі цэн на энерганосьбіты і нявызначанай сітуацыяй у некаторых сектарах бізнесу», — каментуе Цвілікене. Праведзенае Swedbank апытанне таксама паказала, што 35 працэнтаў жыхароў Літвы імкнуцца трымаць збаражэнні ў наяўным выглядзе, а не на банкаўскіх рахунках, што звязваюць з трывожнасцю насельніцтва, якая ўзрасла, адносна стабільнасці фінансавай сістэмы дзяржавы.

«ЛЕАПАРДЫ» І ПРАТЭРМІНАВАНАЯ ЕЖА

Пры гэтым улады актыўна нарошчваюць ваенныя выдаткі. У Літве плануюць павялічыць фінансаванне абароны, заявіла прэм'ер-міністр Інгрыда Шыманітэ. Ваенны бюджэт Літвы за тры гады павялічыўся амаль удвая і сёлета можа дасягнуць трох працэнтаў ВУП. Усяго ж Літва на працягу найбліжэйшых дзесяці гадоў накіруе на ваенныя патрэбы каля 23 мільярдаў еўра. Кіраўнік міністэрства абароны Арвідас Анушаўскас адзначае, што ў дадзеную суму ўваходзіць увесь комплекс затрат падобнага роду, у тым ліку, вядома, закуп узбраенняў. У гэтым плане адной з самых затратных стане здзелка па набыцці за 2 мільярда еўра партыі нямецкіх танкаў Leopard. Насельніцтву краіны пастаянна ўнушаюць, што галоўнае — «абарона ад агрэсіўных і непрадказальных суседзяў», а эканоміка, маўляў, можа і пачакаць.

Тым часам міністэрства эканомікі і інавацый Літвы распрацавала прапанову, па якой максімальны тэрмін рэалізацыі прадуктаў са скончаным тэрмінам прыдатнасці можа складаць 45 дзён. Падобная прапанова аб новых правілах рознічнага гандлю прадстаўлена на разгляд прадпрымальніцкіх арганізацый і адказных інстанцый. Міністэрства аргументуе свае дзеянні «неабходнасцю рацыянальнага выкарыстання прадуктаў», частка якіх, калі заканчваецца ўказаны на ўпакоўцы тэрмін іх спажывання, адбіраецца з крам, хаця яшчэ нейкі час яны маглі б выкарыстоўвацца. У ведамстве паведамілі, што харчова-ветэрынарная служба выпусціць рэкамендацыі па гандлі пратэрмінаванымі прадуктамі.

Раней камісія Сейма Літвы па пытаннях аховы здароўя адобрыла папраўкі да закона аб прадуктах харчавання, якія даюць магчымасць прадаваць у магазінах пратэрмінаваныя прадукты, прыдатныя да ўжывання. Дыскусіі аб такіх таварах у Сейме пачаліся яшчэ восенню 2022 года, калі літоўскія парламентарыі прапанавалі абавязаць крамы аддаваць на дабрачыннасць непрыдатныя для продажу, але бяспечныя прадукты харчавання. Відаць цяпер настаў час пашыраць ініцыятыву.

Пётр ДУНЬКО.

У гасцях у ветэрана

...ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ ЁН ТРОЙЧЫ БЫЎ НА ВАЛАСОК АД СМЕРЦІ

Але дажыў да 100 гадоў

Дажыць да 100 гадоў. Гэта пажаданне часта гучыць на юбілеях у адрас імяніннікаў. Але далёка не кожнаму суджана дасягнуць такога паважнага ўзросту. Чэславу ВАРСЛАВАНУ з аграгарадка Ілья Вілейскага раёна, як ён сам кажа, у гэтым пашанцавала — ён адзначыў свой векавы юбілей шэсць месяцаў таму. Я завітала ў госці да Чэслава Антонавіча перад яго сотым новым годам. Падчас дзвюх гадзін, што мы размаўлялі, ён падзяліўся запаветнай марай і раскрыў сакрэт свайго доўгажыхарства.

ПРА ЦУДОЎНАЕ ВЫРАТАВАННЕ ДЫ ДУШЭЎНУЮ ПАТРЭБУ

Жыве старэйшы жыхар аграгарадка Ілья, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, інвалід вайны II групы ў звычайнай двухпакавай кватэры двухпавярховага дома. «Я чалавек-цуд, гераічная асоба — мне 100 гадоў і 6 месяцаў», — такімі словамі сустрэў нас з кіраўніком музея «Вілейшчына літаратурная» Аксанай Шушкевіч гаспадар. У свае 100 гадоў дзядуля жыве самастойна, сам адчыніў нам дзверы. Як высветлілася пасля, ён амаль нічога не бачыць, але пры гэтым выдатна арыентуецца ва ўласнай кватэры.

«Аксаначка Аляксееўна, — камандуе з парога Чэслаў Антонавіч. — Дапамажы мне, калі ласка, гузікі на кашулі зашпіліць, толькі ўсе да апошняга, да самага каўняра. Я павінен на фотаздымках выглядаць, як з іголачкі». Ён здымае з ручкі шафы светлую кашулю і цёмны пінжак, увешаны ўзнагародамі, і нясе да сябе ў пакой. «А вы, журналіст, — звяртаецца да мяне камандным голасам, — чакайце вось тут, у зале». Пакуль ветэран пераапранаецца, я паспяваю разгледзець чорна-белыя фотаздымкі на сценах. На іх — Чэслаў Антонавіч, зусім малады, сядзіць на траве побач з жонкай на беразе вадаёма, іх дзеці і хатнія жывёлы — кацяня і сабака. У вочы таксама кінуліся кардонная каробка з цыбуляй пад сталом ды лічба 100 з празрыстага пластыку на паліцы серванта. Аб свечках, якія, відаць, задзьмуваў юбіляр, загадваючы жаданне, нагадвае толькі расплаўлены воск блакітнага, жоўтага і ружовага колераў.

— Журналіст, праўнучка, мая дарагая, дзякую, што ты прыехала! — не хавае радасці Чэслаў Антонавіч. — Такая натура мая. Вось хочацца з людзьмі сустрэцца, пагаварыць. Каб запісалі мае думкі, успаміны. Прыемна, што ты па-беларуску размаўляеш. Я таксама мову люблю. Да вайны скончыў 10 класаў, вывучаў беларускую літаратуру: Якуба Коласа, Янку Купалу, Кандрата Крапіву і яго «свінтус-грандыёзус»... Бачыш, яшчэ памятаю *(смяецца)*... Я раней вельмі любіў чытаць, асабліва ваенную літаратуру, шэсць тамоў «Гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» вывучыў ад вокладкі да вокладкі. На працягу ўсяго жыцця збіраў архіў: выразкі з часопісаў, газет пра вайну, усе падзеі храналагічна ад 41-га да 45-га. Гэты каштоўны матэрыял цяпер у майго ўнука, падпалкоўніка з адной з воінскіх часцей Магілёва. Ды і ў памяці маёй засталіся многія падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

Ваяваў я ў складзе стралковай дывізіі, удзельнічаў у баях на Нарэўскім плацдарме, дайшоў аж Польшчы да Германіі. Быў цяжка паранены, кантужаны.

20 кастрычніка 1944 года — драматычны для мяне дзень. Тройчы быў на валасок ад смерці. Першы раз атрымаў лёгкае раненне, другі раз падчас абстрэлу нямецкімі самаходна-артылерыйскімі ўстаноўкамі «Фердзінанд» мяне засыпала зямлёй у адзіночным акопе. У гэты ж дзень я дзяжурыў каля берага ракі, назіраючы за праціўнікам. У нейкі момант разарваўся артылерыйскі снарад, быў ашаламляльны ўдар, ад якога ў мяне і дагэтуль асколкі ў чэлюсці. І ўсё ж такі я выжыў. Шчасце, удача... Відаць, лёс мой такі.

...Зараз не магу ні чытаць, ні пісаць. Не бачу. Для мяне цяпер асноўная радасць у жыцці, маё выратаванне — гэта радыё. Уключаю радыёпрыёмнік і слухаю навіны.

— Нягледзячы на гады і стан здароўя, вы знаходзіце сілы сустракацца з мясцовымі школьнікамі і навучэнцамі Ільянскага аграрнага каледжа. Чаму для вас гэта так важна?

— Калі сыду з жыцця, а гэта непазбежна, усе мае веды, успаміны сыдуць у небыццё. Таму вырашыў сустракацца з моладдзю, размаўляць з ёй, распавядаць пра падзеі, якія захаваліся ў памяці. Я запланаваў сабе гэтую работу. За апошнія гады ў мяне было багата розных выступленняў, я вельмі рады, што засталіся відэазапісы, што пакінуў памяць для дзетак, для школы. Такая мая душэўная патрэба. Я ж педагог, больш за 20 гадоў прапрацаваў выкладчыкам у Ільянскім аграрным каледжы. І заўсёды асаблівую ўвагу надзяляў патрыятычнаму выхаванню моладзі. Расказваў навучэнцам аб ваенных буднях, дзяліўся франтавымі ўспамінамі. Хацеў, каб яны выраслі годнымі грамадзянамі нашай краіны. І зараз, лічу, праца з моладдзю павінна быць на першым месцы.

З Ільянскай сярэдняй школай у мяне склаліся вельмі цёплыя адносіны. Колькі гадоў таму мне неабходна было зрабіць невялікі рамонт у кватэры. Папрасіў дапамагчы дырэктара школы. Ігар Аляксандравіч адгукнуўся і на наступны дзень прыслаў спецыяліста.

ПРА ВЕЛАСІПЕД ДЫ СІНОНІМ АДЗІНОТЫ

— Чэслаў Антонавіч, падзяліцеся сакрэтам свайго доўгажыхарства — як пражыць 100 гадоў і захаваць пры гэтым ясны розум?

— Яшчэ Арыстоцель казаў: «Рух — гэта жыццё, а жыццё — рух». Лічу, што менавіта няспынны рух дапамог мне жыць так доўга. Амаль усё жыццё я быў неразлучны з веласіпедам, любіў выязджаць да Вілейскага вадасховішча — я ж заўзяты рыбалоў у мінулым, ездзіў у лес па ягады ды грыбы. Столькі кіламетраў накруціў за сваё жыццё! Фізічная актыўнасць не толькі ўмацоўвае цела, але і дае энергію, матывацыю і сэнс жыцця. Я і цяпер не здаюся, змагаюся за сваё жыццё ўсімі магчымымі спосабамі. Рэгулярна займаюся гімнастыкай. Чаго-чаго, а сілы духу мне не займаць! Алкаголем ніколі не злоўжываў. Пакуль штосьці бачыў, працаваў у агародзе. Люблю простую ежу. Шторанак пачынаю з цыбулі і часнаку, тым самым умацоўваю імунітэт. Ем мёд, вітаміны. Выпісваю з Мінска бурыя водарасці — здароўе з марскіх глыбіняў. Люблю рыбу. Дарэчы, сустрэчы з моладдзю таксама дапамагаюць падтрымліваць сябе ў форме.

— Раскажыце аб плюсах і мінусах доўгага жыцця?

— Доўгажыхарства — сінонім адзіноты. Усе, каго ты любіў, з кім сябраваў, паміраюць. І гэта непазбежна. Сына пахаваў, Станіслава, токарам на Мінскім трактарным заводзе працаваў, талковы спецыяліст быў. Жонка мая Таццяна Ільінічна, ветурач, мы разам выкладалі ў каледжы, таксама адносна рана сышла з жыцця. Адносіны ў нас былі вельмі добрыя. Самае важнае ў сям'і — давер адно да аднаго, узаемапавага.

Узрост дае пра сябе ведаць. Ужо па стане здароўя не магу выконваць работу па дому так, як раней, не магу сам сябе цалкам абслугоўваць. У побыце мне дапамагае сацыяльны работнік. Люда Альшэўская — дарагі мой таварыш, маё жыццё. Калі б не яна, працягваць жыць адзін у сваёй кватэры я б не здолеў. А для мяне гэта важна, бо, як кажуць, у сваёй хаце і сцены дапамагаюць. Людачка ў мяне галоўны фінансіст. Грошы яна сама лічыць, купляе ўсё, што трэба, медыкаменты неабходныя, прадукты.

Калі казаць аб плюсах, асноўны — гэта жыццё. Я люблю жыццё. Яно для мяне найлепшы падарунак. Я застаў смерць Сталіна, развал Савецкага Саюза, пачатак і канец Другой сусветнай вайны, 90-я... Бачыў, як змянялі адзін аднаго Брэжнеў, Гарбачоў, Ельцын. Заспеў вынаходства камп'ютара, інтэрнэту, мабільнага тэлефона. На маіх вачах праходзіла адно з самых цяжкіх і цікавых стагоддзяў у гісторыі чалавецтва. Ганаруся, што быў сведкам усяго гэтага.

...Часам, калі не магу заснуць, розныя думкі лезуць у галаву. Аналізую, чаму рабіў так, а не інакш. Я шмат памылак у жыцці дапусціў. З гадамі разумееш, што рэчы, якія ты цаніў, далёка не самае галоўнае, напрыклад, грошы...

— А што самае галоўнае?

— Здароўе. Яно цяпер больш жаданае, чым любое золата свету.

ПРА САМАЕ ВАЖНАЕ СВЯТА ДЫ ЛЁТЧЫКА-ГЕРОЯ

— Калі не сакрэт, якое жаданне вы загадалі, калі задзьмувалі свечкі на свой 100-гадовы юбілей?

— Я загадаў мірнае неба над нашай Беларуссю. Каб не было вайны. Мне радасна, што адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя майму 100-годдзю. Мяне віншавалі ў актавай зале Ільянскага аграрнага каледжа, была дэлегацыя на чале са старшынёй Вілейскага райвыканкама, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, тэлебачанне прыязджала.

Мару дажыць да 9 мая і выступіць на 80-гадовы юбілей Вялікай Перамогі. Хацелася б святкаваць гэты дзень разам з усімі беларусамі. Дзень Перамогі — для мяне самае важнае свята. Заўсёды чакаю, рыхтуюся да выступлення. Нас, ветэранаў, засталося мала, адзінкі ў раёне. Калі шчыра, я ніколі не думаў, што дажыву да гэтага часу.

— Аб чым думаеце, калі кладзецеся спаць, што вас хвалюе?

— Падчас аперацыі па ліквідацыі бабруйскага «катла» было падбіта некалькі нашых самалётаў-бамбардзіроўшчыкаў. Адзін з іх з чорнымі клубамі дыму падаў на наш дом. Я глядзеў на яго з канавы побач з домам. Раптам адбыўся цуд: самалёт рэзка стаў набіраць вышыню. Відаць, лётчык быў цяжка ранены і страціў прытомнасць — калі ж самалёт пачаў падаць, ён часова прышоў у прытомнасць і рэзка пацягнуў рукаятку на сябе, тым самым вывеў самалёт з піке. У выніку ён перакуліўся і выбухнуў у іншым месцы. А я дагэтуль думаю, хто ж гэты лётчык-герой, які выратаваў мне жыццё?.. Дзіўлюся, чаму так здарылася, што я адзін у Ільянскім сельсавеце застаўся ветэран.

Яшчэ, калі кладуся спаць, думаю: «А трэба ж заўтра неяк памыцца». Мабілізую на гэту справу апошнія сілы. І калі памыюся, вельмі радасна мне, адчуваю сябе героем. Думаю аб дзетках сваіх, аб унуках. Перажываю за іх здароўе. Сёння ўвечары буду згадваць нашу з вамі размову. Мне было вельмі радасна, што да мяне прыедзе карэспандэнт газеты «Звязда», але і адначасова перажываў, было вельмі трывожна, ці змагу я вытрымаць гэту сустрэчу... Я яе вытрымаў *(смяецца)*. Жыццё, сапраўды, цудоўная рэч!

Надзея ДРЫНДРОЖЫК,
Фота аўтара
і з архіва Ільянскай школы.
Вілейскі раён.

Яе ведаюць, любяць і чакаюць з ёй сустрэчы ў кіно, у Тэатры-студыі кінаакцёра. Яна ў адказ сумленна і аддана працуе, пражываючы лёс кожнай сваёй гераіні нібы ўласны. Дзясяткі спектакляў і кінафільмаў дазволілі актрысе паказаць гледачу самыя розныя грані свайго таленту і майстэрства. І сёння яна працягвае здзіўляць і радаваць нас. Сустрэўшыся з заслужанай артысткай Беларусі Валерыяй Арланавай, мы змаглі даведацца пра яе погляды на прафесію, самую жаданую ролю і важны складнік шчасця тут і цяпер.

Валерыя АРЛАНАВА:

«ТВАЯ ПРАФЕСІЯ — ГЭТА ТВАЯ СУТНАСЦЬ»

— З апошняга з вашым удзелам з задавальненнем паглядзела фільм «Ліст чакання», дзе агучваецца шэраг актуальных тэм. Валерыя Юр'еўна, як вам працавалася на карціне, і што дапамагала ўжывацца ў ролю сваёй гераіні?

— Мне было крыху складана ў тым сэнсе, што гераіня, якую я там увасабляю, не зусім на мяне падобная. І яе погляды на жыццё, на нейкія сітуацыі не супадаюць з маімі. Давялося ў некаторых момантах нават паспрачацца з рэжысёрам. Мне было няпроста сыграць звычайную, у нечым наіўную жанчыну, якая вельмі любіць сваіх унукаў. У выкананні мне, мабыць, дапамагало, што супалі атмасфера ў карціне і тое, што я сама ў той час была ў крыху разабраным, разарваным стане. Мой стан добра лёг на вобраз гераіні, якая таксама знаходзіцца ў разгубленасці ад таго, што адбываецца вакол яе. Як, мабыць, і многія людзі зараз ва ўсім свеце адчуваюць і перажываюць штосьці падобнае. Бо ты не разумееш нават дакладна, што будзе заўтра.

— Гісторыя вашай гераіні ў фільме — гэта гісторыя прыгожай жанчыны пры таленавітым мужу. Чым па-жаночы адгукнулася яна вам?

— Але я так разумею, што яна і сама не без таленту і здольнасцяў. Зараз вобраз гераіні ў мяне чамусьці выклікаў паралелі з Аленай Андрэянай са спектакля «Дзядзька Ваня», таму што яна таксама пры таленавітым мужу адчувае сябе нерэалізаванай, непатрэбнай і нешчаслівай. У фільме мая гераіня крыху больш сталая і яна свядома абрала свой шлях: прысвяціла сябе любімаму мужу, сям'і. І ў яе не ўзнікае ўнутраных пакут, як у чэхаўскіх гераінь. Можа, яна мудрэйшая за мяне.

— Аднак тут самі напрошваюцца паралелі з вашай біяграфіяй, дзе ў вас, прыгожай і таленавітай, побач муж не меней таленавіты. Ці даводзілася вам па жыцці сутыкацца са стэрэатыпам прыгожай жонкі пры паспяховым мужу?

— Мой муж болей таленавіты... А ўвогуле прыгожых людзей вельмі часта падазраюць у адсутнасці таленту. Я ганаруся сваім мужам, але ў мяне ёсць і свая работа, дзе я рэалізоўваюся. І ніколі нікому нічога не даказваю, хоць разумею, што гаварылі ўсякае. У тым ліку і пра тое, быццам я выйшла замуж з-за грошай. Але мы, напрыклад, пражылі з Аляксандрам у інтэрнаце 12 гадоў. Якія грошы? Наша гісторыя абсалютна пра іншае.

— У шматсерыйным фільме «Каралева прыгажосці» вы ўвасобілі вобраз паспяховай жанчыны ў свеце моды. А што вам у жыцці дазваляе адчуваць сябе прыгожай?

— У фільме я іграю ролю дырэктара дома мадэляў «Кузнецкі мост» 60-х гадоў. І гэта адна з маіх любімых карцін. Мне там было вельмі цікава здымацца. Увогуле, даволі часта я іграю людзей, якія маюць дачыненне да моды. А для мяне прыгажосць — гэта найперш пра павагу да сябе і да тых, хто побач з табой. Адчуванне ўласнай прыгажосці павінна быць унутры чалавека. Бо, як казаў Аляксандр Васільеў, «трэніровачны касцюм — гэта ваша ўласнае паражэнне». Я па-рознаму магу быць апранута, і людзі бачылі мяне на сцэне і ў кадры як нафарбаванай, так і без касметыкі. Таму не маю патрэбы ўпрыгожваць сябе, бо мая аўдыторыя і без гэтага ведае, чаго я вартая. Разам з тым мне як жанчыне важна і падабаецца ствараць цікавыя вобразы і ў жыцці, быць яркай, бо гэта ёсць у жаночай прыродзе.

— Акцёрская праца дазволіла вам прымераць самыя розныя ролі ў тэатры і ў кіно. Ці ёсць яшчэ вобразы, якія хацелі б увасобіць?

— За гады работы ў кіно маю шмат розных роляў, дзе была і прыгожай, і сыграла ўсё, што можна, непрыгожае. Ужо вельмі хочацца быць сабой, бо аднасць з самой сабой — вельмі прыемнае пачуццё, калі ты ведаеш, хто ты і адчуваеш сябе паўнавартасна ў гэтым свеце. А калі прыходзіш на рэпетыцыю, то цябе гэтага пазбаўляюць, бо там трэба ўвасабляць прапанаванага персанажа.

— Шмат часу вам патрэбна, каб настроіцца на рабочы працэс?

— Здараецца, што шмат часу патрэбна, каб зразумець персанажа. Вось зараз рэпеціруем новую ролю і я разумею, што зноў не буду сабой. У выніку пачынаю шукаць, што можна гераіні пакінуць ад сябе, а якія рысы, наадварот, узмацніць альбо прыглушыць. Вобраз складваю як канструктар. І так у кожнай ролі трэба адчуць і прыдумаць нешта, за чымсьці паназіраць, каб скласці ў адно цэлае. Але гэта прафесія, і, праўду кажучы, апошнім часам мяне вельмі засмучае, што, аказваецца, у многіх людзей скажонае ўяўленне аб працы акцёра. Неяк пачула ад аднаго чалавека з нашай сферы, маўляў, што там працаваць у драматычным тэатры — вывучыў словы і ідзі расказвай. І такое неразуменне працэсу мяне проста шакіруе. Яго яшчэ можна прабачыць простым людзям, але калі ты ў гэтай прафесіі, то як можна не разумець, наколькі сур'ёзная, цяжкая і глыбокая наша дзейнасць? Што ў ёй трэба выкладвацца, а не проста красавацца.

— Можа, якраз гэтае неразуменне і нараджае той узровень непрафесіяналізму, які глядач часам бачыць на экране і на сцэне...

— Цяпер вельмі шмат людзей пачалі называць сябе акцёрамі, рэжысёрамі, не маючы адпаведнай адукацыі. У грамадстве нівеліруецца ўспрыманне прафесіі і, адпаведна, складваецца меркаванне, што быць у ёй можа кожны. Не буду за ўсіх акцёраў казаць, а па сабе ведаю, што ты пастаянна ў творчасці. Ноччу штосьці вучыш, думаеш пра ролю, пра сцэнарый — проста не выключаешся з творчага працэсу, таму што твая прафесія — гэта твая сутнасць. І нельга прыраўноўваць тэатр да завода, бо мы працуем не па зменах.

— Вы скончылі ВНУ ў 90-я гады, і той час пасля характэрызавалі «ніхто нікому не патрэбен быў». Як было рабіць першыя сур'ёзныя крокі ў прафесіі, і калі вы адчулі яе прэстыж?

— Прэстыж акцёрскай прафесіі я, мабыць, да сёння не адчула. Калі ў 1990 годзе я паступіла ў тэатральную ВНУ, то мне хацелася быць актрысай, было сваё наіўнае, рамантычнае ўяўленне пра гэтую дзейнасць. І ў нашай Акадэміі мастацтваў у той перыяд сапраўды адчувала сябе нібы дома. Зараз думаю, гэта ж неверагодна, што я нават вуліцы не бачыла ў той час, таму што калі мы суткамі ў Акадэміі рэпеціравалі, то нават 90-я быццам міма прайшлі. Так, было холадна, голадна, часам нават пяць долараў не магла знайсці, каб выжыць, здаралася, нават страчвала прытомнасць, але мы гарэлі працай і былі шчаслівыя, бо было жаданне вучыцца, рэалізоўвацца. Цяпер, думаю, ужо не змагла б так.

— І вы кажаце, што да сёння не адчулі прэстыж сваёй прафесіі...

— Менавіта, бо запатрабаванасці не так шмат. Вядома, ёсць любоў гледача. І як казаў мой настаўнік Ілья Львовіч Курган, «ты павінен быць акцёрам, на якога будуць прыходзіць людзі». У гэтым сэнсе мая праца мае попыт. А вось калі прэстыж разумець як абсалютны поспех, які можа супакоіць акцёра, то ў каго ён ёсць? Цяпер нават тыя артысты, якія мелі прэстыж, па розных прычынах яго страцілі. І вось ты чытаеш артыкул і разумееш, што публіка, якая ўчора любіла акцёра, сёння ўжо ставіцца да яго з пагардай і не хоча ісці на фільмы з яго ўдзелам. У гэтым сэнсе ў нас вельмі жорсткая прафесія.

— Ці трэба быць унутрана да гэтага пастаянна гатовым?

— Я лічу, што сіла — у абсалютнай адкрытасці. Тады ўсё будзе скрозь цябе праходзіць.

— А пазнавальнасць накладвае нейкі адбітак на ваша паўсядзённае жыццё?

— Гэта прыемна. Цябе пазнаюць у самых розных месцах — і ў краме, і на рынку... Мне падабаецца, калі да мяне падыходзяць з пазітывам, дзякуюць, размаўляюць. Але здараецца і так, што хтосьці можа ананімна напісаць нешта крыўднае, хоць гэта толькі адзінкі. І ты не разумееш, чаму так, бо ты ж нікому не зрабіла нічога дрэннага.

— За гады ў прафесіі якое меркаванне ў вас склалася пра беларускае кіно?

— У нашага кіно вельмі добрая гісторыя. Тут працавалі і працягваюць тварыць вялікія рэжысёры. На жаль, іх вельмі мала. А ў цэлым зараз нібыта зноў перыяд маленства, калі беларускаму кінематографу трэба ў складаных умовах пачынаць штосьці наноў. Я сама апошнім часам з нашым кіно судакранаюся з перыядычнасцю раз у пяць гадоў, таму мне складана нешта ацэньваць знутры.

— Па якіх крытэрыях вы выбіраеце праекты?

— Тут у мяне, як і ў жыцці, з людзьмі ўсё само сабой атрымліваецца. Нейкім унутраным пачуццём ацэньваеш сітуацыю. Магчыма, так спрацоўвае вопыт. А што датычыцца ганарару, то, безумоўна, здараліся сітуацыі, калі я разумела, што згаджаюся на работу дзеля грошай. Я да працы стаўлюся сумленна, таму кожную сваю ролю імкнуся сыграць добра.

— Да прыходу ў Тэатр-студыю кінаакцёра вы паспелі папрацаваць у іншых тэатрах, але толькі тут адчулі сябе «як дома». Дзякуючы чаму гэтае адчуванне з'явілася?

— Гэта як з каханнем — ты адразу ўсё адчуваеш. Я прыйшла, і калектыў мяне прыняў, мая манера ігры таксама тут гарманічна ўпісалася. Не было ў мяне такога, каб я некаму штосьці даказвала. І да сёння я працую з некаторымі людзьмі ўжо амаль трыццаць гадоў. У наш тэатр і да мяне прыходзілі розныя акцёры, але, улічваючы яго спецыфіку кіношнай падачы матэрыялу, не кожнаму ўдаецца ўліцца ў агульную гісторыю.

— У вашай біяграфіі ёсць шэраг роляў у пастаноўках па класічных творах. Як лічыце, ці патрэбна ў тэатры класіку па-новаму падаваць?

— У класічных пастаноўках іграюць сучасныя людзі, таму мімаволі там усё роўна з'яўляюцца нейкія сучасныя інтанацыі. Але разам з тым ты разумееш, што класіка з кожным днём усё больш сучасная. Зараз складана чымсьці здзівіць. І я асабіста супраць наватарства на пустым месцы. Я не супраць новых эксперыментаў, кірункаў, але, што датычыцца класічных твораў, то спачатку трэба зразумець напісанае аўтарам і толькі потым нарошчваць сваё. Не трэба падладжвацца пад публіку і лічыць, што тады ты будзеш прыняты і зразумелы ёю. Няхай гледачы выходзяць на новы для сябе ўзровень. Калі мы ставілі «Ваўкі і авечкі», я за два тыдні да прэм'еры разумела, што не ведаю тэксту. Адчуванне, што там шмат паўтораў, спецыфічных абаротаў. Мы так не размаўляем. І тады я стала паглыбляцца ў тэкст, літаральна завучваць яго. У рэшце рэшт гэта яшчэ і павага да працы іншага чалавека. Сядзеў, напрыклад, Чэхаў або Булгакаў, пісаў свае творы, думаў над кожным словам, пражываў яго. І калі мы ўзялі такую п'есу для пастаноўкі, то трэба данесці тое, што пражыў аўтар.

— Чым вы займаецеся, калі не іграеце?

— Жыву. Бытавыя пытанні вырашаю. Я ўсё раблю сама.

— А за што ўдзячны сваім бацькам?

— Найперш за тое, што я ёсць у гэтым свеце. Добра разумею, што ў маіх бацькоў, як і ў многіх іншых людзей, было складанае жыццё. І таму нам, дзецям, часам здаецца, быццам ім трэба было неяк па-іншаму сябе з намі паводзіць. Але тое ўсё я ўжо даўно адпусціла. І цяпер больш думаю аб тым, чаго каштавала маме і тату вырасціць нас з сястрой. Маці мая была гэткая актрыса па жыцці, а бацька — спакойны, мяккі і маўклівы чалавек. І падабаецца нам тое ці не, але мы складаемся з нашых бацькоў. І мая сястра часам заўважае, што ў сваіх ролях я, бывае, маміны ці татавы рысы праяўляю.

— Што для вас не рыфмуецца з каханнем?

— Шмат усяго не рыфмуецца, але і многае трэба цярпець дзеля кахання. Інакш усё лёгка можа разбурыцца за секунду. Я дакладна не з тых жанчын, хто, што толькі не па іх, грукае дзвярамі і сыходзіць. А вось зразумець, прабачыць, пашкадаваць — гэта пра мяне. Увогуле людзям трэба размаўляць і проста не замоўчваць тое, што для іх важна.

— Чаго вы чакаеце ад новага дня, і чаго не хапае для шчасця тут і цяпер?

— Маё любімае слова — «дастаткова», але сёння сапраўды многага не хапае. Спакою, людзей, магчымасці будаваць планы. Многае разбурана па дурасці, і бессэнсоўна шкадаваць. Жывем сёння. А ўвогуле мне зараз вельмі не хапае сонца.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва гераіні.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. № 631/С-67657 (назначение – Здание специализированное культурно-просветительного и (или) зрелищного назначения, наименование – Клуб «Талуть», общая площадь – 308,7 кв. м, составные части и принадлежности: А1-2/д-Клуб «Талуть»)	2 880,00	288,00	144,00
2	Центрифуга лабораторная «Орбита»	9,36	0,94	0,47

Лот	Наименование	Местонахождение и земельный участок	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
